ЦАРКВУ ПАДПАЛІЛІ, ЛЮДЗЕЙ РАССТРАЛЯЛІ...

МС

БАЦЬКАМІ СТАНОВЯЦЦА Ў РАДЗІЛЬНІ

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 МАЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 100 (29722)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЦЫТАТА ДНЯ

Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«Беларусь — краіна з сапраўды багатай гісторыка-культурнай спадчынай і прыродным набыткам. На нашай зямлі захавалася мноства архітэктурных, гістарычных і культурных помнікаў, знаходзіцца вялікая колькасць унікальных прыродных рэсурсаў, маляўнічых лясных і водных комплексаў. Нягледзячы на шматлікія войны, якія праходзілі на нашай тэрыторыі, беларусам удалося зберагчы многія культурныя артэфакты — як матэрыяльныя, так і нематэрыяльныя, а некаторыя з іх і наогул узнавіць практычна з нуля. Без ведання роднай краіны і яе мінуўшчыны немагчыма стаць сапраўдным патрыётам».

СВЯТЛО Ў АКНЕ

Найстарэйшаму жыхару вёскі Юзяфоўка Хоцімскага раёна Івану ПЕШКІНУ сёлета спаўняецца дзевяноста гадоў. Іван Фёдаравіч памятае перадваенны час — падлетку было тады дзесяць гадкоў, — успамінае і расказваенны: як вярталіся дамоў параненыя франтавікі, змучаныя вязні канцлагераў і вывезеныя на прымусовыя работы. Пешкін ведае цану, якую заплаціла яго Юзяфоўка, аддаўшы дзясяткі душ сваіх жыхароў.

Пасля службы ў марфлоце мужчына працаваў у калгаснай рамонтна-будаўнічай брыгадзе. Цяпер каля колішняга вясковага клуба стаіць невялікі абеліск у гонар землякоў, якія не вярнуліся з той вайны. Адным з аўтараў стварэння і ўстаноўкі помніка быў і герой здымка Іван Пешкін.

Сёлетнюю зіму Іван Фёдаравіч правёў у вёсцы, не паехаў, як раней, да дзяцей у горад. Да яго прыязджалі родныя, найчасцей — малодшая дачка Людміла, якая жыве ў суседнім райцэнтры Касцюковічы. Кожны свой адпачынак яна імкнецца праводзіць у роднай вёсцы — у бацькоўскай хаце. Вядома, дапамагае апрацоўваць і садзіць агарод, наводзіць парадак у двары і доме, шчыраваць каля печы і газавай пліты. Ёй насамрэч падабаецца быць побач з найраднейшым чалавекам.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- Стрым для абітурыентаў па паступленні ў ВНУ і ССНУ правядзе НЦПІ 26 мая.
- **Сярэдні заробак у Беларусі ў красавіку склаў Br1567,8.**
- «Беларуснафта» па выніках 2021 года аднавіла ўзровень даковіднага трафіку на прыдарожных АЗС.
- **Рэспубліканскі конкурс па робататэхніцы «Ратавальнік будучыні» пройдзе 1 чэрвеня ў Мінску.**
- Беларусь вывучае магчымасць вытворчасці камплектуючых да расійскіх самалётаў.
- **Oxfam: капітал 10 найбагацейшых чалавек планеты перавышае сумарную маёмасць 40 % жыхароў Зямлі.**

Кіберпагроза

РЫЗЫКІ ЛІЧБАВАЙ ПРАСТОРЫ

Як не трапіць на вуду інтэрнэт-махляроў

Цалкам вырашыць праблему кібернебяспекі немагчыма, паколькі шкодныя праграмы, сайты і самі інтэрнэт-махляры пастаянна ўдасканальваюцца. Аднак ведаць пра існаванне інтэрнэт-пагроз і схемы, па якіх зламысныкі выманьваюць грошы ў даверлівых людзей, трэба. Пра актуальныя кіберпагрозы і найбольш распаўсюджаныя віды махлярства, якія пагражаюць як дарослым, так і дзецям, расказалі эксперты.

СТАР. 3

Па сутнасці справы

НЯСУМНАЕ ЛЕТА

Гульні на свежым паветры, падарожжы, конкурсы, дыскатэкі і новыя сябры — для многіх школьнікаў менавіта з гэтымі паняццямі асацыіруецца летні аздараўленчы лагер. Аматарам такога адпачынку сёлета можна па-добраму пазайздросціць. Рэспубліканскі старт летняй аздараўленчай кампаніі дадуць 30 мая ў «Зубраняці», а 3—5 чэрвеня аналагічныя мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Летнія аздараўленчыя лагеры з дзённым знаходжаннем масава пачнуць сваю работу 1 чэрвеня, з кругласутачным знаходжаннем — на працягу першай дэкады чэрвеня. «Цяпер забяспечаны падбор і навучанне кадраў для работы ў лагерах. У цесным узаемадзеянні з МУС, Міністэрствам аховы здароўя, Міністэрствам абароны, МНС праведзена работа па навучанні начальнікаў загарадных аздараўленчых лагераў і спецыялістаў, якія будуць курыраваць летні адпачынак і аздараўленне, — расказала **кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК** на прэс-канферэнцыі «Аб завяршэнні навучальнага года і правядзенні выпускных экзаменаў. Пытанні арганізацыі дзіцячага адпачынку і аздараўлення ў летні перыяд» у Нацыянальным прэс-цэнтры. — Выхаваўчая работа ў лагерах будзе праводзіцца з улікам знамянальных дат дзяржаўных свят: гэта і 22 чэрвеня — Дзень памяці і смутку, і Дзень Незалежнасці — 3 ліпеня, вялікая ўвага будзе аддавацца і нашай сімволіцы. Найлепшыя выхаванцы змены падніміць сцяг, усе прысутныя выканаюць Дзяржаўны гімн. Гэта неад'емная частка выхаваўчай работы ва ўстановах адукацыі».

СТАР. 4-5

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Парламенцкі дзённік

Перамога, здабытая адзінствам

Дэпутаты завяршаюць падрыхтоўку да канферэнцыі, прысвечанай гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне

Завяршаецца падрыхтоўка міжнароднай парламенцкай канферэнцыі «Гістарычная памяць. Вялікая Перамога, здабытая адзінствам», якая пройдзе 14-15 чэрвеня ў Мінску. Пра гэта журналістам перад пасяджэннем адмысловай рабочай групы расказала намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Лілія АНАНІЧ.

«Сёння ў фармаце рабочага разгляду мы пройдземся па ўсіх тэматычных секцыях канферэнцыі. Заўважу, што падрыхтоўка, якая вядзецца фактычна паўгода, у нас выйшла на фінішную прамую. Шмат прыедзе замежных удзельнікаў, актыўна адгукаюцца парламенцкія дэлегацыі, чакаем высокі ўзровень прадстаўніцтва», — паведаміла дэпутат.

«Для нас вельмі важна падняць на міжнародным узроўні тэму генацыду беларускага народа. Мы бачым апошнім часам, як адкрываюцца новыя старонкі страшнай трагедыі беларускага народа».

Міжнародная парламенцкай канферэнцыі «Гістарычная памяць. Вялікая Перамога, здабытая адзінствам», па яе словах, — маштабны праект, які рэалізоўваецца Палатай прадстаўнікоў разам з Генеральнай пракуратурай, Міністэрствам абароны, Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Да ўдзелу запрошаны дэлегацыі парламентаў з былых рэспублік СССР, прадстаўнікі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, Парламенцкай Асамблеі АДКБ, Парламенцкага Сходу Беларусі і Расіі, дзяржаўных органаў, навуковых, экспертных і дыпламатычных супольнасцяў.

Падчас канферэнцыі будуць працаваць пяць навукова-практычных секцый, якія адлюстроўваюць кірункі захавання і развіцця гістарычнай памяці. «Для нас вельмі важна падняць на міжнародным узроўні тэму генацыду беларускага народа. Мы бачым апошнім часам, як адкрываюцца новыя старонкі страшнай трагедыі беларускага народа. У рамках расследавання крымінальнай справы будзе праводзіцца тэматычная секцыя. Мы спадзяёмся, што гэта стане зыходным пунктам, каб дабівацца прызнання ў свеце генацыду беларускага народа. Важна сёння паглядзець на гістарыяграфію па Вялікай Айчыннай вайне, як сёння маладое пакаленне вучоных расстаўляе акцэнты на гэтай тэме на постсавецкай прасторы», — расказала парламентарый.

Па словах Ліліі Ананіч, грамадства цяпер павінна думаць не толькі пра тое, што зрабіла Беларусь для захавання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, а і даць адказ на новыя выклікі і пагрозы.

«Мы спадзяёмся на сур'ёзную размову ў аспекце Вялікай Перамогі ў грамадска-медыйным дыскурсе. Гэта тое, што датычыцца нашай інфармацыйнай прасторы і таго, як сёння ў грамадстве дадзеная тэма выкладаецца, якія ёсць пагрозы, калі нам супрацьстаіць разбуральная машына неанацызму. Інфармацыйная прастора сёння — як поле бітвы. І на гэтым полі бітвы за Вялікую Перамогу мы павінны змагацца так, як змагаліся нашы бацькі і дзяды ў 1941—1945 гадах», — рэзюмавала дэпутат.

Марыя ДАДАЛКА.

Блізкая ўлада

УСЕ ПЫТАННІ БУДУЦЬ ВЫРАШАЦЦА. ПА ЗАКОНЕ

Праблемы, што хвалююць жыхароў Гомельшчыны, старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО разгледзеў падчас прамой тэлефоннай лініі і прыёму грамадзян у Петрыкаве.

Да кіраўніка рэгіёна паступіў тэлефонны зварот ад жыхаркі вёскі Пухавічы Жыткавіцкага раёна.

— Вецер сарваў дах на доме, на хляве, паламаў плот з металапрофілю, — распавядала жанчына пра шкоду яе домаўладанню, якую ўчыніў ураган на мінулым тыдні.

Раённыя службы выедуць на адрас, каб на месцы вызначыць, чым можна дапамагчы, запэўніў заяўніцу губернатар.

Жыхарка вёскі Матневічы Чачэрскага раёна звярнулася па дапамогу да губернатара з праблемай здачы малака:

— У вёсцы 100 кароў. Заўсёды здавалі малако на МТФ. Толькі летась — 240 тон. Калі гаспадарку далучылі да іншай, пачаліся пытанні са здачай.

Як падкрэсліў Іван Крупко, літаральна на працягу некалькіх дзён будзе вызначаны шлях вырашэння агучанай сітуацыі.

— Ёсць дзяржаўныя малочныя заводы, ёсць сельскі Савет, паглядзім магчымасці. Малако — запатрабаваны прадукт, — заспакоіў губернатар аўтара звароту.

Старшыня аблвыканкама даў канкрэтнае даручэнне разабрацца з дарожнай праблемай у аграгарадку Кашэвічы, што на Петрыкаўшчыне. Зварот аб добраўпарадкаванні тэрыторыі паступіў ад жыхаркі населенага пункта. Кіраўнік рэгіёна паабяцаў, што спецыялісты абследуюць дарогі і ўжо ў панядзелак сітуацыю разгледзяць на нарадзе.

На прыём да губернатара звярнуліся жыхары Жыткавіч з праблемай прыватызацыі жылля.

Па сутнасці звароту спецыялісты ўдакладнілі, у канцы 1980-х гадоў арганізацыя, у якой на той момант працаваў галава сям'і, набыла для іх дом.

З заявай аб прыватызацыі жылля грамадзяне звярнуліся за тыдзень да заканчэння працэсу. Пры гэтым не быў пададзены поўны пакет дакументаў. Ускладніла сітуацыю і тое, што жыллё пераходзіла з рэспубліканскай уласнасці ў раённую. Плюс на тэрыторыі былі выяўлены гаспадарчыя пабудовы, узведзеныя самавольна. Цяпер дом на балансе ЖКГ і вырашыць пытанне з прыватызацыяй можна толькі ў судовым парадку.

— Дапамажыце афарміць, аднавіць дакументы, — звярнуўся Іван Крупко да адказных спецыялістаў. — Прапішыце алгарытм, што павінны зрабіць грамадзяне, што — мясцовыя службы.

На асабістым прыёме губернатара былі абмеркаваны і іншыя пытанні. Вызначаны шляхі вырашэння ўсіх агучаных праблемных сітуацый.

— Усе пытанні будуць вырашацца. Па законе, — падвёў вынік прыёму грамадзян у Петрыкаве Іван Крупко.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Весткі з Паднябеснай

Беларуска-кітайскае супрацоўніцтва мае значны патэнцыял

На платформе Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва варта стварыць дзейсны канал інфармацыйнага ўзаемадзеяння паміж сродкамі масавай інфармацыі. Аб гэтым падчас міжнароднага вэбінара, які арганізавалі Кітайскі камітэт ШАС па добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве сумесна з парталам «Хуаньцюван», заўважыў старшы рэпарцёр газеты «Жэньмінь жыбаа», кансультант «Хуаньцюван» Дзін Ган.

Як адзначыў кітайскі медыяэксперт, заходнія СМІ нярэдка дамінуюць на інфармацыйным полі ў прыцягненні ўвагі людзей. Аднак кантэнт, які яны выпускаюць, часта тэндэнцыйны і, мякка кажучы, не зусім адпавядае рэчаіснасці. Таму ўзнікае патрэба ў фарміраванні каналаў аб'ектыўнай інфармацыі. Адной з пляцовак для аб'яднання канструктыўных медыя можа выступіць Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, якая стала найбуйнейшай сусветнай рэгіянальнай платформай узаемадзеяння. Цяпер яе членамі з'яўляюцца восем краін з агульным насельніцтвам больш за тры мільярды чалавек, якія фарміруюць чвэрць глабальнага ВУП. Чатыры дзяржавы (сярод іх Беларусь) маюць статус назіральнікаў, яшчэ шэсць з'яўляюцца партнёрамі па дыялогу. «Наша супрацоўніцтва — новая мадэль, — падкрэсліў Дзін Ган. — Узаемадзеянне неабходна ўзмацняць і пашыраць».

У людзей мусіць быць доступ да надзейных крыніц інфармацыі. Таму медыя неабходна пашыраць ахоп за кошт больш разнастайнай прапановы, прыцягваць аўдыторыю. Напрыклад, «Жэньмінь жыбаа» рэалізоўвае ў тым ліку праекты на рускай і англійскай мовах. Адзін з прыкладаў — партал «Хуанцюван», які актыўна і паспяхова працуе на замежную аўдыторыю. Дарэчы, да рускамоўнага кірунку «Жэньмінь жыбаа» прычынілася і «Звязда». На працягу амаль шасці гадоў мы ажыццяўляем сумесны праект, які прадстаўлены на нашых інтэрнэт-парталах (на сайце «Звязды» ён называецца «Весткі з Кітая»), а таксама на старонках выданняў. Тут адлюстроўваецца шырокая палітра жыцця Беларусі і Кітая. Адметна, што ў музеі аднаго з вядучых СМІ свету — «Жэньмінь жыбаа» — адзін са стэндаў прысвечаны менавіта нашаму сумеснаму праекту.

Прыкладам плённага інфармацыйнага ўзаемадзеяння, якое мяркуецца актывізаваць на пляцоўцы ШАС, можа быць супрацоўніцтва ў межах найбуйнейшага транснацыянальнага праекта сучаснасці «Адзін пояс, адзін шлях». Ён увасабляецца вось ужо амаль дзевяць гадоў. Адпаведныя прапановы старшыня КНР Сі Цзіньпін вылучыў восенню 2013-га. Спачатку гэтая ініцыятыва Паднябеснай выклікала недавер, але паспяхова прайшла самую бескампрамісную праверку — часам — і паспяхова працягваецца. Мегапраект злучыў усе кантыненты планеты і прыносіць адчувальныя выгады ўсім яго ўдзельнікам. «Пояс і шлях» стаў адной з найбольш папулярных тэм у інфармацыйнай прасторы. Кітай актыўна падтрымлівае дадзены трэнд, арганізоўвае паездкі і сустрэчы журналістаў з розных краін свету. За час рэалізацыі глабальнага праекта быў праведзены шэраг штогадовых форумаў супрацоўніцтва СМІ.

Падчас Першага форуму высокага ўзроўню па міжнародным супрацоўніцтве «Адзін пояс, адзін шлях» старшыня КНР адзначыў, што Кітай створыць механізм супрацоўніцтва і платформу па гуманітарным узаемадзеянні, у тым ліку сетку па інфармацыйным супрацоўніцтве. Сказана — зроблена. Інфармацыйная сетка «Адзін пояс, адзін шлях» (The Belt and Road News Network — BRNN) адлічвае сваю гісторыю з красавіка 2019-га. Тады ў Пекіне прайшло першае пасяджэнне Савета BRNN. Ініцыятарам сусветнай платформы па медыязносінах выступіла газета «Жэньмінь жыбаа». Як адзначыў у сваім прывітальным лісце Сі Цзіньпін, сродкі масавай інфармацыі адыгралі актыўную канструктыўную ролю ў працэсе прасоўвання сумеснага будаўніцтва ў рамках глабальнай ініцыятывы. Каб прадоўжыць гэты пазітыўны працэс, вельмі важна было своечасова стварыць функцыянальную пляцоўку міжнароднага супрацоўніцтва СМІ. Інфармацыйная сетка «Адзін пояс, адзін шлях» аб'яднала больш чым 200 СМІ з усіх кантынентаў. Адметна, што сярод іх і «Звязда», якая таксама ўвайшла ў склад BRNN і актыўна супрацоўнічае з калегамі на згаданай платформе.

Так што, як паказвае практыка, медыйнае ўзаемадзеянне — магутны рэсурс. «Яго неабходна развіваць больш актыўна, — перакананы Дзін Ган. — Увогуле беларуска-кітайскае супрацоўніцтва мае значны патэнцыял і імкліва развіваецца ў многіх сферах. Адзін з яскравых прыкладаў — індустрыяльны парк «Вялікі камень». Але варта пашыраць не толькі індустрыяльны, прамысловы складнік нашых узаемавыгадных адносін. Не менш важны гуманітарны кірунак і супрацоўніцтва ў медыйнай сферы».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

РЫЗЫКІ ЛІЧБАВАЙ ПРАСТОРЫ



ВІШЫНГ, ФІШЫНГ, АНЛАЙН-КРЭДЫТ

Ахвярамі інтэрнэт-злачынцаў становяцца не толькі простыя грамадзяне, але і тыя, хто мае глыбокія веды ў інфармацыйных тэхналогіях, кажа **Аляксандр ГРЫЦУК, начальнік упраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці крымінальнай міліцыі УУС Мінаблвыканкама:**

— Адно з найбольш распаўсюджаных інтэрнэт-злачынстваў — вішынг — калі злачынцы тэлефануюць людзям, выдаюць сябе за супрацоўнікаў банкаў ці міліцыі і пад рознымі прычынамі выманьваюць у пацярпелых рэквізіты банкаўскіх рахункаў і картак. Адбываецца гэта праз айпі-тэлефанію ці месенджары: Viber і WhatsApp, у якіх можна падмяніць нумар і паставіць лагатып пазнавальных беларускіх банкаў. Называць рэквізіты не трэба, бо гэтыя звесткі і так ёсць у сапраўдных супрацоўнікаў банкаў і міліцыі.

Апошнім часам ахвярам актыўна прапануецца адкрыць крэдыт, каб з яго дапамогай нібыта пагасіць іншы, узяты на імя асобы, якой тэлефануюць. Пры гэтым чалавека запэўніваць, што робіцца гэта для таго, каб выкрыць няшчырых супрацоўнікаў банкаў.

Калі паступае такі званок, трэба спыніць размову, бо кібермахляры ўсё больш удасканальваюць майстэрства псіхалагічнага ўплыву. 90 % ахвяр адзначаюць, што ведалі пра падобную схему падману, і ўсё роўна трапіліся на вуду, падкрэсліў спецыяліст.

Падман, калі махлярская спасылка маскіруецца пад звычайную, якая нібыта вядзе на пэўны інтэрнэт-рэсурс, а насамрэч прыводзіць да махляра, атрымаў назву фішынг. У адрасе мяняецца літаральна адзін сімвал, і калі ахвяра пераходзіць па такой спасылцы і ўводзіць свае асабістыя даныя, яны трапляюць да злачынцаў.

— Найбольш часта такая схема сустракаецца на анлайн-пляцоўцы «Куфар», калі «прадавец» ці «пакупнік» прапануе ахвяры перайсці да стасункаў у інтэрнэт-месенджарах, — заўважыў Аляксандр Грыцук. — Махляр дасылае фішынгавую спасылку, якая нібыта павінна паскорыць працэс дастаўкі заказу. Ахвяра пераходзіць па ёй, указвае рэквізіты банкаўскай карткі і губляе грошы. Усе размовы весці трэба толькі на абароненай пляцоўцы, не пераходзячы па спасылках ад трэціх асоб.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ШАНТАЖ, ВЫМАГАННЕ, ПЕРАДАПЛАТА

Вельмі распаўсюджана махлярства сёння і ў сацыяльных сетках, калі прадавец патрабуе перадаплату за нейкі прадукт. Атрымаўшы грошы на электронны кашалёк ці картку, злачынца знікае з сацсеткі, часта разам са старонкай, канстатавалі эксперты.

Сацыяльныя сеткі — сапраўдная скарбонка персанальнай інфармацыі пра чалавека. Тут ёсць у тым ліку дамашні адрас, нумар тэлефона і нават дасыланыя адзін аднаму інтымныя фота. Пры гэтым людзі нячаста непакояцца аб абароне сваіх старонак і выкарыстоўваюць нескладаныя паролі. Калі акаўнт узломліваюць — усе звесткі і здымкі трапляюць да зламысніка, які пачынае шантаж.

— Гандаль бінарнымі апцыёнамі — амаль забытае, але цяпер ізноў актуальнае злачынства. Яго ахвяры вядуцца на яркую рэкламу і дзеля хуткага абагачэння наймаюць сабе лжэброкераў, якія замест грамадзян на біржы гандлююць бінарнымі апцыёнамі, — нагадаў начальнік упраўлення. — Схема ў тым, што лжэброкер гандлюе нібыта ад імя чалавека, у акаўнце якога паказваецца даволі вялікі прыбытак. Пасля махляр прапануе вывесці грошы на банкаўскую картку. Чалавек дае рэквізіты, аднак замест атрымання сумы губляе тую, што была на картцы. Другая схема — махляр раіць ахвяры адкрыць новы рахунак (ад тысячы долараў), каб перавесці «зароблены» даход у наяўнасць.

Людзі нячаста непакояцца аб абароне сваіх старонак і выкарыстоўваюць нескладаныя паролі. Калі акаўнт узломліваюць — усе звесткі і здымкі трапляюць да зламысніка, які пачынае шантаж.

Падмануты чалавек пачынае шукаць дапамогу і, здараецца, натыкаецца на лжэадвакатаў, якія працягваюць падманваць ахвяру, прапануючы адкрыць крыптакашалёк, каб яны маглі скласці іскавую заяву. І з гэтага рахунку таксама скрадваюць грошы. Перш чым спакушацца на вялікія сумы, трэба праверыць у інтэрнэце спісы лжэтрэйдынгавых кампаній ці звярнуцца на спецыялізаваны форум, параіў эксперт.

УЗЛОМ СЕРВЕРА, ПАДМЕНА E-МЭЙЛУ

Да кіберпагроз адносяцца таксама атакі на прадпрыемствы і арганізацыі розных формаў уласнасці з мэтай зарабіць ці ў межах канкурэнтнай барацьбы. Гэта DDoS-атакі, узломліванне сервераў ці электроннай пошты, каб атрымаць аддалены доступ да файлаў кампаній. У Беларусі такія масавыя атакі на прадпрыемствы і ВНУ здарыліся напрыканцы 2020-га і пачатку 2021-га, нагадаў Аляксандр Грыцук:

— Калі зламыснік атрымлівае несанкцыянаваны доступ да файлаў і серверу, ён шыфруе іх і патрабуе выкуп за дэшыфроўку. А калі бухгалтар арганізацыі яшчэ і не дастаў з камп'ютара банкаўскі лічбавы ключ, то кіберзлачынцы атрымліваюць доступ да фінансавых аперацый. Праз сістэму дакументаабароту яны фарміруюць ад імя прадпрыемства плацежку на пэўную суму і пераводзяць грошы на падстаўныя фірмы.

Яшчэ адзін спосаб кібермахлярства — падмена паштовай скрыні прадпрыемства, праз якую вядуцца перагаворы пра пастаўкі ці набыццё прадукцыі. Напрыканцы здзелкі, калі гаворка ідзе пра аплату, з падробленага e-мэйлу (які адрозніваецца літаральна на адзін сімвал) дасылаецца пісьмо з новымі плацежнымі рэквізітамі. Такая падмена часта застаецца незаўважанай, паколькі адрасы вельмі падобныя.

ГРУМІНГ, БУЛІНГ, СВАЦІНГ

Асобная кібернебяспека пагражае нашым дзецям, якія становяцца інтэрнэт-карыстальнікамі ў вельмі раннім узросце. У пошуках гульняў ці мульцікаў праз сецівa малыя могуць выпадкова трапіць на сайт з кантэнтам 18+. Каб абмежаваць дзяцей ад гэтага, бацькам трэба размаўляць з малымі і кантраляваць іх наведванне інтэрнэт-прасторы.

Малы можа трапіць у сітуацыю інтэрнэт-грумінгу, калі дарослы чалавек наладжвае даверлівыя стасункі з дзіцем, каб сексуальна задавальняцца, прыкідваючыся такім жа падлеткам. У выніку дзеці могуць дасылаць яму свае інтымныя фотаздымкі ці ўвогуле ўцягнуцца ў выраб порнаматэрыялаў.

Пагражае дзецям у інтэрнэце і кібербулінг — калі малога могуць цкаваць праз сацсеткі, анлайн-гульні, форумы. Робяць гэта, як правіла, знаёмыя і суседзі, якія ведаюць дзіця асабіста. Выклікае ў спецыялістаў боязь і магчымае аднаўленне груп смерці, накшталт сумна вядомага «сіняга кіта».

— Частыя перапады настрою дзіцяці, змена манеры выкарыстання гаджэтаў (малы можа пасярод ночы памкнуцца ў сецівa), памяншэнне колькасці сяброў у сацыяльнай сетцы, выдаленне акаўнту ўвогуле — найбольш яскравыя з'явы, якія сведчаць аб тым, што дзіця хутчэй за ўсё падвяргаецца інтэрнэт-булінгу, — акрэсліў спецыяліст. — Бацькі могуць і самі прагледзець старонкі свайго малога, выявіць, ці ёсць там абразлівыя словы.

Акрамя таго, што дзеці могуць пацярпець ад злачынцаў у інтэрнэце, іх саміх могуць уцягнуць у крымінальныя схемы. Занепакоенасць у спецыялістаў выклікае кіберзлачыннасць сярод падлеткаў, якіх спакушаюць абяцаннем лёгкіх грошай і выкарыстоўваюць у якасці закладчыкаў наркотыкаў ці асоб, якія абнаяўліваюць грошы.

Займаюцца малыя і свацінгам — заведама хлуслівым выклікам (з паведамленнем пра небяспеку) міліцыі ці аварыйных службаў на адрас іншага падлетка, з якім, магчыма, ён гуляе ў анлайн і хоча адцягнуць яго ўвагу такім чынам.

— За апошні час свацінг з забаўкі аматараў анлайн-гульняў ператварыўся ў масавую з'яву і вялікую праблему для праваахоўнікаў, — падзяліўся Аляксандр Грыцук. — Гэта дзейнасць нармальную работу транспарту, спецслужбаў, устаноў і прадпрыемстваў, наносіць эканамічную шкоду. А паведамленне пра магчымы выбух ці падпал здольнае яшчэ і выклікаць паніку сярод насельніцтва. Між тым адказнасць для такіх «жартаўнікоў» наступае з 14 гадоў, таму вельмі важна навучыць дзіця лічбавай гігіене, а таксама прывіць яму правілы паводзін у інтэрнэце.

Кібермахляры ўсё больш удасканальваюць майстэрства псіхалагічнага ўплыву. 90 % ахвяр адзначаюць, што ведалі пра падобную схему падману, і ўсё роўна трапіліся на вуду.

ПА ЛІЧБАВЫХ СЛЯДАХ...

Крымінальныя злачынствы ў сферы кіберпрасторы расследуюцца доўга. Гэта звязана з трансгранічнасцю дзейнасці крымінальных груп, фігуранты якіх часта знаходзяцца за межамі Беларусі, ахарактарызаваў сутнасць такіх спраў **Ігар ДАМАРАЦКІ, начальнік аддзела па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і незаконнага абароту наркотыкаў следчага ўпраўлення УСК па Мінскай вобласці:**

— Пры расследаванні падобных спраў абавязкова прысутнічае пэўная лічбавая інфармацыя: нумары тэлефонаў, электронныя пошты, кашалькі, спасылкі, якімі карысталіся зламыснікі для сваіх дзеянняў. Следчы камітэт распрацаваў аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму «След», у якую ўносяцца ўсе выяўленыя лічбавыя сляды.

Большая частка кіберзлачынстваў адбываецца па артыкуле 212 Крымінальнага кодэкса (КК) «Крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі». Летась па ім было ўзбуджана звыш дзвюх тысяч спраў, а нанесеная беларусам шкода ацэнена ў больш як тры мільёны рублёў. Сёлета заведзена 577 спраў, з якіх 495 — па 212 артыкуле.

Перадаваць рэквізіты банкаўскіх картак праз інтэрнэт, аддаваць грошы на «ратаванне» свайго кур'ерам і верыць абяцанкам пра хуткі заробак нашых грамадзян вымушае недастатковая лічбавая адукацыя. Аднак калі ў жаданні падзарабіць чалавек перадае рэквізіты сваёй банкаўскай карткі для ўдзелу ў крымінальнай схеме, то ён становіцца саўдзельнікам злачынства. Згодна з артыкулам 222 КК, яму можа пагражаць да дзесяці гадоў зняволення.

Ірына СІДАРОК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Эрдаган аб'явіў аб пачатку турэцкай ваеннай аперацыі ў Сірыі

Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган аб'явіў аб пачатку ваеннай аперацыі «Крыніца міру» ў Сірыі супраць тэрарыстаў, паведамляе РІА «Навіны» са спасылкай на Twitter кіраўніка дзяржавы.

Турэцкая армія нанесла авіяўдары па горадзе Рас-эль-Айн на паўночным захадзе правінцыі Хасекэ, таксама была атакавана вёска аль-Маджрафа каля горада і пазіцыі SDF у вёсках аль-Машрафа і Харбат аль-Банат.

«Нашы мэты — знішчыць тэрарыстычны калідор, які спрабуюць стварыць на нашых паўднёвых граніцах. Аперацыя «Крыніца міру» нейтралізуе тэрарыстычныя пагрозы ў аднасінах да Турцыі і прывядзе да стварэння бяспечнай зоны, якая садзейнічае вяртанню сірыйскіх бежанцаў у свае дамы. Мы захаваем тэрытарыяльную цэласнасць Сірыі і вызвалім народ рэгіёна ад ціскоў тэрарыстаў», — гаворыцца ў паведамленні кіраўніка дзяржавы ў Twitter.

Затрыманы былы прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон

Экс-прэзідэнта Малдовы Ігара Дадона затрымалі на 72 гадзіны ў рамках крымінальнай справы, распачатай па чатырох артыкулах Крымінальнага кодэкса, паведаміла прэс-сакратар генеральнай пракуратуры Мар'яна Керпек.

Антыкарупцыйная пракуратура краіны і супрацоўнікі Службы інфармацыі і бяспекі правялі вобыск у ягоным доме. Таксама праводзяцца вобыскі ў іншых месцах.

«Як толькі ў Малдове справы ідуць дрэнна, Дадона выклікаюць да пракурора, каб адцягнуць увагу насельніцтва ад надзённых праблем. Так было ў снежні мінулага года, калі тарыф на газ вырас у некалькі разоў. Цяпер, калі ў краіне новы скачок цэн, гэта хочуць паўтарыць», — пракаментаваў падзею сам экс-прэзідэнт у эфіры тэлеканала «НТБ-Малдова».

Ён дадаў, што не баіцца ніякіх мер, уцякаць з краіны не збіраецца і гатовы даць рашучы бой апанентам.

Тым часам намеснік старшыні Камітэта Дзярждумы па справах СНД Канстанцін Затулін у гутарцы з «Газетой.Ru» назваў затрыманне Ігара Дадона «палітычнымі рэпрэсіямі супраць апазіцыі» і спробай уцягнуць краіну ў падзеі ва Украіне.

ААН: рэкордныя 100 млн чалавек пакінулі дамы з-за канфліктаў па ўсім свеце

Колькасць людзей, вымушаных ратавацца ад узброеных канфліктаў, насілля, парушэнняў правоў чалавека і праследаванняў, упершыню за ўсю гісторыю назіранняў перавысіла адзнаку ў 100 млн, гэтаму таксама спрыялі баявыя дзеянні на тэрыторыі Украіны, паведамляе Euronews са спасылкай на Агенцтва ААН па справах бежанцаў.

«Гэта павінна паслужыць трывожным сігналам для вырашэння і прадухілення разбуральных канфліктаў, спынення праследаванняў і ліквідацыі асноўных прычын, якія вымушаюць нявінных людзей пакідаць свае дамы», — заявіў вярхоўны камісар ААН па справах бежанцаў Філіпа Грандзі.

Узброеныя канфлікты і крызісы ў Эфіопіі, Буркіна-Фасо, М'янме, Нігерыі, Афганістане і Конга таксама паўплывалі на рост бежанцаў. Колькасць людзей, якія пакінулі дамы, але засталіся ў межах сваіх краін, ацэньваецца ў 53,2 млн.

Раней стала вядома, што Польшча, якая прыняла рэкордную колькасць бежанцаў з Украіны, не мае ўрадавых праграм, каб падтрымліваць і рассяляць іх.

У АДКАЗЕ ЗА АЛЬФА-ЛЕТНІК

Каб дзецям было камфортна, за справу ўзяліся шэфы

Калі ў маі прайсці на тэрыторыю лагера «Сузор'е», што ў Гродзенскім раёне, можна ўбачыць нямала людзей у рабочых спяцоўках. Літаральна кожны корпус ахоплены іх увагай. Адны тынкуюць, іншыя фарбуюць... «Гэта нашы шэфы», — кажа дырэктар летніка Ала КІЎЛЯК.

Кожны ведае сваю справу, таму кіраўнік спакойна можа выдзеліць колькі часу, для таго, каб правесці экскурсію па самаму лепшаму летніку краіны. Такі статус «Сузор'е» атрымала за леташнюю аздараўленчую кампанію. Ці лёгка адпавядаць статусу?

Ала Вікенцеўна прапануе ўбачыць усё сваімі вачыма. Маршрут пачынаем з адміністрацыйнага корпуса, вакол якога вядзецца пасадка кветак. Жанчыны жартуюць, і мы з добрым настроем ідзём далей. У карпусах завяршаюцца будаўнічыя работы. Паўсюдна вёдры з фарбамі, маляры перабраліся на балкон.

— Самыя маштабныя работы вяліся ў другім корпусе, дзе будуць пражываць малыя 6-7 гадоў, — расказвае дырэктар. — Там замянілі ложкі, зрабілі рамонт у пакоях і калідорах, адрамантавалі дах. Дарэчы, ён абышоўся бюджэту амаль у 40 тысяч рублёў. Устанавілі новую дзіцячую пляцоўку для малых, раней яе проста не было. Гэта даволі значныя капіталаўкладанні.

І далёка не адзіныя. Кіраўнік летніка вядзе ў святая святых кожнай такога роду ўстановы — харчовы блок. Ён даволі вялікі, ёсць асобнае памяшканне з новым халадзільным абсталяваннем. Таксама гонар дырэктара — новая магутная пасудамыечная машына. Работы чакаюць прыборы для нарэзкі хлеба, каўбасы і сыру.

Абноўлены і медыцынскі блок. Тут кабінет прыёму ўрачоў, пакой адпачынку ці псіхалагічнай разгрузкі, тры ізалятары з санвузламі і душам, асобныя ўваходы для хворых і здаровых дзяцей. Сёлета будуць працаваць два ўрачы і пяць медсясцёр. Летась ізалятары пуставалі, кажа Ала Вікенцеўна. Захворванняў удалося пазбегнуць, на такі ж стан спраў спадзяюцца і сёлета.

Наш маршрут ідзе на баскетбольную пляцоўку. Яна будзе забяспечана гумовым пакрыццём, выдаткі на яго складуць 30 тысяч рублёў. Мяркуецца, што заняткі будуць цікавымі і якаснымі, бо інструктарам па фізічнай культуры прыйдзе працаваць майстар спорту па баскетболе.

Падыходзім да возера. Можна сказаць, што дзецям з ім вельмі пашанцавала, бо мала які летнік мае такую цудоўную магчымасць, як купанне. А тут ёсць свая водная зона з пірсам і нават невялікім амфітэатрам каля яго. Сёлета пірс адрамантавалі і цяпер чакаюць спецыялістаў таварыства выратавання на вадзе, каб тыя пачысцілі дно і далі дазвол на купанне. Вядома, чакаецца і праверка санітарных службаў на наяўнасць шкодных бактэрый.

— Думаю, калі будзе добрае надвор'е, зможам плаваць два разы на дзень, для дзяцей гэта важны сродак аздараўлення, — адзначыла суразмоўніца. — Тут праводзім яшчэ і розныя мерапрыемствы, напрыклад, канцэрт альбо паказ фільмаў вечарам. Ставім вялікі экран на пірсе, дзеці сядзяць на лаўках, глядзяць кіно. А за экранам — цудоўныя краявіды вячэрняга возера.

Усе гэтыя складнікі дазволілі летніку «Сузор'е» стаць найлепшым у Беларусі па аздараўленні дзяцей у мінулым сезоне. Сёлета калектыў плануе трымаць марку. Мяркуецца ўзяць удзел у конкурсе па медыцынскім забеспячэнні, арганізацыі харчавання і выхаваўчай рабоце.

Зразумела, што такія параметры не захаваць, калі не будзе трывалай матэрыяльна-тэхнічнай базы. А на яе падтрыманне патрэбныя значныя сродкі. Менавіта з-за адсутнасці належнага фінансавання былі зачынены некаторыя летнікі. Адзін з іх знаходзіцца літаральна за некалькі дзясяткаў метраў ад «Сузор'я». Ведамасны лагер стаў непад'ёмным для ўстановы. Цяпер частка домікаў пустуе, частку выкупіла прадпрыемства і здае ў арэнду за сімвалічную плату.

А вось «Сузор'е» ўзяў пад сваё крыло райвыканкам. На падрыхтоўку да сёлетняй аздараўленчай кампаніі ад яго паступіла 25 тысяч рублёў. Яшчэ 20 тысяч выдзеліў абласны бюджэт і шэсць тысяч — рэспубліканскі. Усе згаданыя сродкі — крыху больш за 50 тысяч — ужо асвоены.

Але гэта далёка не ўсё. Значную дапамогу аказваюць прадпрыемствы-спонсары. Напрыклад, сёлета тут разлічваюць атрымаць на аднаўленне летніка 70 тысяч рублёў, частка якіх пойдзе на гумовы насціл баскетбольнай пляцоўкі.

Летнік мае і сваіх пастаянных шэфаў. Без іх, лічыць дырэктар, было б складана падрыхтаваць усе аб'екты да камфортнага пражывання.

— Рашэннем Гродзенскага райвыканкама за нашым летнікам замацаваны прадпрыемствы Гродзенскага раёна. Гэта Скідальскі цукровы камбінат, сельгаспрадпрыемствы «Прагрэс-Верцялішкі», «Путрышкі», «Гожа», «Азёры Гродзенскага раёна» і агракамбінат «Скідальскі». Менавіта іх работнікі занятыя на будаўнічых работах. Усе вельмі адказна ставяцца да такой дзейнасці, — заўважае Ала Вікенцеўна. — Таксама ад сельгаспрадпрыемстваў паступіла дадаткова 25 тысяч рублёў.

Перад кожным сезонам вызначаецца аб'ём работ. Шэфы, як правіла, прыязджаюць у пачатку мая і поўнасцю робяць рамонт на «сваіх» аб'ектах — шпаклююць, тынкуюць, фарбуюць. Такая сістэма працуе не першы год. Усе выдзеленыя сродкі ідуць менавіта на падрыхтоўку да новага аздараўленчага сезона. Напрыклад, работнікі СВК «Азёры» занятыя на аднаўленні альтанак. Яны даволі вялікія, іх трэба адрамантаваць, пафарбаваць.

Побач з камфортам у цэнтры ўвагі — бяспека дзяцей. Аказалася, што па ўсім перыметры летніка, а гэта амаль пяць гектараў, устаноўлены 19 відэакамер. Працуе кнопка Дэпартамента аховы, яна ёсць на спецыяльным пульце, які ахоўнік бярэ з сабой, калі ідзе на агляд тэрыторыі. Згодна з інструкцыяй, бацькоўскія дні і наведванне дзяцей не прадугледжаны. З імі будуць трымаць кантакт педагогі праз сацыяльныя сеткі альбо непасрэдна тэлефанаваць. Дзеці такім чынам таксама змогуць мець кантакт пры неабходнасці ці па жаданні. Але свае мабільныя тэлефоны яны павінны адразу аддаць бацькам.

— Дзеці не будуць сумаваць, — запэўніла кіраўнік летніка. — Кожны дзень насычаны забаўляльнымі і спартыўнымі мерапрыемствамі. Усе змены — тэматычныя, разам з тым будзе зроблены акцэнт на Год гістарычнай памяці.

Будаўнічыя работы павінны быць завершаны да канца мая, а з 8 чэрвеня пачнецца заезд першай змены, іх будзе чатыры. Плануецца аздаравіць за сезон 1200 дзяцей, па 270 чалавек у кожнай змене.

Аздараўленне ў першую чаргу праходзяць дзеці сельгаспрацоўнікаў і бацькоў з прадпрыемстваў-спонсараў. Але не толькі. Праўда, заяўкі трэба падаваць за некалькі месяцаў да пачатку сезона.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Магчымасць для тых, хто абмежаваны

База адпачынку ў вёсцы Прыбар Бялыніцкага раёна сёлета рыхтуецца прыняць дзяцей ужо ў 25-ы раз. Дарэчы, зімой яна таксама не пустуе, з сярэдзіны кастрычніка да сярэдзіны красавіка база становіцца прытулкам для адзінокіх пенсіянераў з Бялыніцкага раёна.

— Дзяржава размясціла ў нас сацыяльны заказ ад упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Бялыніцкага райвыканкама, які так і называецца — пансіянат сезоннага пражывання для пажылых і адзінока пражываючых людзей, — удакладняе **дырэктар базы адпачынку для дзяцей, падлеткаў і асобных катэгорый грамадзян у вёсцы Прыбар Ірына ДЗЯМІДАВА.** — Мы можам прыняць і абслужыць максімум 12 чалавек. Жадаючых таксама хапае.

Летам тут адначасова могуць адпачыць 60—70 дзяцей. Змена ў 10-12 дзён пралятае як адно імгненне: заняткі, гульні, творчыя вечары з песнямі пад гітару... Побач рака — Друць. А яшчэ лес з яго птушыным рознагалассем і яловым пахам...

Гэтая база не ўваходзіць у спіс аб'ектаў Цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні. Яна належыць магілёўскай дабрачыннай арганізацыі «Табея» і існуе дзякуючы фінансавай падтрымцы спонсараў. «Спачатку ў нас аздараўляліся дзеці з чарнобыльскіх раёнаў, а цяпер акцэнт робім на тых, якія растуць у малазабяспечаных сем'ях ці маюць праблемы са здароўем, — расказвае **кіраўнік дабрачыннай арганізацыі Павел БРОДАЎ.** — Мы плённа супрацоўнічаем з гарадской арганізацыяй інвалідаў. Пры неабходнасці дзеці з абмежаванымі магчымасцямі знаходзяцца ў нас разам з бацькамі».

За час існавання лагера праз яго, па падліках Паўла Бродава, прайшло каля сямі тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак. Некаторыя з іх сёння прывозяць сюды сваіх дзяцей.

Ірына Дзямідава адзначае, што шанц пабываць у лагеры ёсць у кожнага дзіцяці, для якога бацькі не знайшлі грошай на аздараўленне.

— Пуцёўка бясплатная, — кажа яна. — Наша база трымаецца на валанцёрах і спонсарах. Таму і змены пачынаюцца ў першай-другой дэкадзе ліпеня. Чакаем, калі моладзь вызваліцца ад вучобы і зможа дапамагаць. Адзін з нашых былых выхаванцаў, Марк Батурэвіч, заўсёды прыязджае ў якасці памочніка выхавальніка.

Ірына падкрэслівае, што стаць валанцёрам можна толькі пры ўмове адсутнасці схільнасці да моцных напояў, цыгарэт. І контроль наконт гэтага строгі.

Летась тут за чатыры змены аздаравілі 210 дзяцей. Як будзе сёлета, пакуль не загадваюць. З кожнай зменай звычайна працуюць розныя групы валанцёраў. Яны загадзя распрацоўваюць сваю праграму адпачынку. Сплавы на лодках па Друці, калі пашчасціць з надвор'ем, квэсты, спартыўныя мерапрыемствы — сумаваць не прыходзіцца.

У дзяцей савецкага перыяду лагер заўсёды асацыіраваўся з вогнішчам, якое абавязкова ладзілі на развітанне. Тут вогнішча, як той казаў, стацыянарнае, зробленае з улікам усіх патрабаванняў ратавальнікаў. Так званая чаша для агню абкладзена камянямі. Дзятва з задавальненнем праводзіць тут вечары, спявае пад гітару.

Кожны дзень адпачынку распісаны па хвілінах. Пад'ём у восем гадзін, зарадка, а дзявятай — сняданак, а палове дзясятай — заняткі па інтарэсах, потым агульналагерная гульня накшталт папулярнай у дзяцей «Захоп сцяга». Пасля — абед, ціхая гадзіна, падвячорак.

— Харчаванне ў нас выдатнае, — заўважае Ірына Дзямідава. — Мы складаем меню так, каб было смачна дзецям. Калі нехта не есць катлеты з цыбуляй, робім без цыбулі або пераціраем яе цалкам. Шмат выпечкі, рабіць якую таксама дапамагаюць валанцёры.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва летніка.

З ухілам на гістарычную памяць і будучую прафесію

На Магілёўшчыне плануюць зрабіць адпачынак для дзяцей максімальна пазнавальным і насычаным

Ужо заўтра, 26 мая, два лагеры ў Бабруйскім раёне — «Шчаткава» і «Мара» — напоўняцца дзіцячымі галасамі. На Магілёўшчыне гэтым летам будзе працаваць 15 стацыянарных лагераў, яшчэ тры размесцяцца на базе санаторыяў «Дубравенка», «Сосны» і «Свіслач».

— На 20 мая некаторыя аздараўленчыя лагеры былі ўжо гатовыя на 95 працэнтаў, — адзначыў у размове з карэспандэнтам «Звязды» **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Калі ёсць складаныя моманты, мы іх аператыўна вырашаем, робім усё для таго, каб дзецям было камфортна і ўтульна. Максімум увагі аддаём санітарнаму стану аздараўленчых пляцовак. Яны павінны мець праточнае водазабеспячэнне, месцы, дзе можна было б пасушыць рэчы, і гэтак далей.

Сёлета плануецца аздаравіць 44 тысячы юных жыхароў вобласці, але гэтай лічбай колькасць гасцей ні ў якім разе не абмяжоўваецца. Калі будзе попыт, магчымасці будуць пашыраны, паабяцаў суразмоўнік. Лагеры адкрыюцца пры школах, у палявых умовах, на спартыўных базах і не толькі. Каля 28 тысяч навучэнцаў ахопяць 2150 аб'яднанняў па інтарэсах. Шмат падлеткаў будзе адначасова і адпачываць, і займацца карыснай дзейнасцю. Больш за дзесяць тысяч школьнікаў плануецца задзейнічаць у валанцёрскім руху — яны дапамогуць людзям сталага веку і зоймуцца добраўпарадкаваннем.

Да ведама

Сёлета на падрыхтоўку стацыянарных аздараўленчых лагераў на тэрыторыі Магілёўскай вобласці было выдзелена з усіх крыніц фінансавання больш чым 450 тысяч рублёў. Усяго на правядзенне летняй аздараўленчай кампаніі вобласці накіравана з рэспубліканскага бюджэту больш як шэсць мільёнаў рублёў.

Па традыцыі, вялікі попыт на адпачынак на базе санаторыяў. У той жа лагер на базе санаторыя «Дубравенка», які належыць ведамству чыгункі, на першую змену паступіла 360 (!) заявак пры наяўнасці 240 месцаў. На гэтай жа базе забраніраваў месцы на чацвёртую змену філіял нямецкага фонду ў Магілёве. З ліку дзяцей, якія тут будуць адпачываць, дзесяць — украінцы. База адметная тым, што тут, акрамя адпачынку, можна прайсці яшчэ і лячэнне. На месцы створаны атрад, дзе адпачывальнікаў пазнаёмяць з азамі прафесіі чыгуначніка.

У Чавускім раёне лагер разгорнецца на плошчах біятлоннай базы, дзе выхоўваюцца будучыя спартыўныя зоркі. Мясціны, дарэчы, гістарычныя. Тут захавалася ліпавая алея графскага маёнтка Талстых — знакамітага дваранскага роду, які асталяваўся ў Чавусах у канцы XVIII стагоддзя. Апошнім часам тут была створана адна з найлепшых у краіне спартыўных баз па лыжных відах спорту. Адсюль у вялікі спорт выйшлі Дзінара Алімбекава і Сяргей Новікаў.

— Летась мы паспрабавалі арганізаваць на гэтай базе летняе аздараўленне і бачым, што эфект ёсць, — адзначае Валерый Малашка. — Будзем і надалей прыцягваць дзяцей да біятлона. Сёлета наогул шмат увагі аддаецца спартыўным лагерам. Да 25 мая гэтыя аб'екты, як і ўсе астатнія, павінны атрымаць пашпарты гатоўнасці.

У сярэднім пуцёўка на 18 дзён у лагер з кругласутачным знаходжаннем каштуе 517 рублёў, пры дзяржадатацыі — 229 рублёў. Гэта значыць, бацькі заплацяць як мінімум палову дадзенай сумы. Але калі прадпрыемства, дзе яны працуюць, таксама выдзеліць матэрыяльную дапамогу, пуцёўка ў лагер можа абысціся ўсяго ў 10 працэнтаў ад поўнага кошту.

Сёлета будзе прадоўжана работа і такіх папулярных у дзятвы аздараўленчых летнікаў, як «Крыніца» абласнога Цэнтра творчасці, «Шчаткава» — ад філіяла Бабруйскіх электрасетак і «Мара», які знаходзіцца ў падпарадкаванні ўпраўлення адукацыі Бабруйскага гарвыканкама. Замест чатырох традыцыйных змен будзе арганізавана пяць.

Адзін з палатачных лагераў ад Магілёўскага абласнога Цэнтра творчасці будзе працаваць нават на тэрыторыі Віцебшчыны. Дзеці пабываюць на месцах баявой славы, больш даведаюцца пра гісторыю роднага краю. Наогул плануецца, што па ваенных сцежках, дзе адбываліся цяжкія баі, падчас летняй аздараўленчай кампаніі пройдзе каля пяці тысяч школьнікаў.

Больш за 2,5 тысячы юных жыхароў Магілёўшчыны, якія адносяцца да сірот і дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, зможа адпачыць бясплатна. У Асіповічах, напрыклад, на базе спецыяльнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі апорна-рухальнага апарату ўпершыню адкрыецца змена для падлеткаў з абмежаванымі магчымасцямі. Да іх паслуг цікавая праграма, аздараўленчыя працэдуры, басейн, ЛФК. Дзеці будуць знаходзіцца пад наглядам медыкаў, з імі будуць займацца прафесійныя педагагічныя кадры.

Таксама ўпершыню адкрываецца ваенна-патрыятычны лагер на базе Магілёўскага кадэцкага вучылішча. Ужо 40 падлеткаў пажадалі азнаёміцца з умовамі жыцця кадэтаў — і, магчыма, нехта вызначыцца з будучай прафесіяй. Па словах Валерыя Малашкі, у Год гістарычнай памяці ў лагерах будзе зроблены акцэнт на выхаваўчай рабоце.

— Спецыяльна разгортваем патрыятычныя лагеры, арганізоўваем адпаведныя змены ў школьных, кругласутачных і іншых лагерах, — падкрэсліў ён. — Вельмі шырока падключаем установы культуры, кінатэатры, музеі. Удзячны аддзелам унутраных спраў і па надзвычайных сітуацыях за актыўнае ўзаемадзеянне — на ўзроўні кіраўнікоў упраўленняў гэтых ведамстваў знойдзена поўнае паразуменне па пытаннях патрыятычнага выхавання дзяцей. Гэта яшчэ і прафарыентацыя, якая сёння мае не менш важнае значэнне, чым усё астатняе. У цэлым робім усё для таго, каб лета прайшло бяспечна, цікава і пазнавальна. Каб дзеці набралі вагу і духоўна, і фізічна, сталі сапраўднымі грамадзянамі нашай краіны.

Свае дзверы на Магілёўшчыне расчыніць 731 лагер, з якіх 171 будзе працаваць кругласутачна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота з сайта holiday.by. Адзін з папулярных у Магілёўскай вобласці лагер «Чайка».

Наша апытанне

КАЛІ СЫН АДЗІН І КАЛІ ІХ ПЯЦЁРА

Дзецям на карысць пажыць ва ўмовах калектыву

Карэспандэнт газеты пацікавілася меркаваннем бацькоў пра летні адпачынак дзяцей у лагеры. Ім было прапанавана адказаць на пытанні, ці з ахвотай накіроўваюцца іх дзеці ў летнікі, чаму прымаюць рашэнне наконт адпачынку школьнікаў у дзіцячым калектыве і чым карысны вопыт знаходжання ў такіх установах. На пытанні адказалі брастаўчанкі.

Алена НЕКРАШЭВІЧ:

— Мой сын цяпер заканчвае сёмы клас і ў чэрвені ўпершыню паедзе ў дзіцячы аздараўленчы лагер. Саша чакае гэтую падзею з цікавасцю. Такое рашэнне мы прынялі па ініцыятыве мужа. Ён лічыць, што ў справе выхавання хлопчыка найбольшая роля належыць бацьку. Менавіта ён настаяў, каб сын наведваў спартыўную секцыю. І хоць той часам не супраць паленавацца, напрыклад, прапусціць трэніроўку, бацька ўважліва сочыць і не дае спуску. У доўгіх гутарках з сынам ён настойліва даводзіць, што заняткі спортам вельмі спатрэбяцца, калі прыйдзе час, напрыклад, служыць у войску, ды і наогул для здароўя і жыцця спорт не лішні. Сын, здаецца, разумее. Я падтрымліваю мужа. У мяне ёсць кліентка, а працую я цырульнікам, у якой сын праходзіць тэрміновую службу. Яна кажа, што вельмі пашкадавала, што ў свой час не праявіла настойлівасці наконт яго заняткаў у спартыўнай секцыі.

А ў лагеры апрыёры шмат магчымасцяў для фізкультуры і спорту. Да таго ж мы вырашылі, што Сашу на карысць пабыць без бацькоў. Ён жа ў нас адзін, увагай (як нашай, так і бабуль-дзядуль) ніколі не быў абдзелены. А тут трэба паспрабаваць самому хоць у мінімальнай ступені наладжваць быт, сачыць за адзеннем, падтрымліваць парадак вакол сябе.

І яшчэ я лічу, што гэта добрая нагода для сына і яго раўеснікаў на нейкі час «вылезці» з тэлефонаў: яны ж цяпер амаль не ўмеюць камунікаваць паміж сабой ужывую, перагаворваюцца і перапісваюцца найбольш па смартфонах. У летніку, наколькі мне вядома, праграма разлічана на доўгае знаходжанне на свежым паветры. Мы цікавіліся: будуць праводзіцца гульні, спартыўныя спаборніцтвы.

Пуцёўку муж узяў у сваёй арганізацыі, ён працуе ў будаўнічай галіне, плаціць нам трэба ўсяго 10 працэнтаў ад кошту, гэта вельмі выгадна. Ну а калі Сашу спадабаецца, налета зноў будзем адпраўляць у лагер.

Наталля КРЭМЯНЕЎСКАЯ:

— Мае дзеці некалькі гадоў запар ездзілі ў летнія лагеры. Цяпер яны дарослыя, сын па прафесіі праграміст, дачка стала ўрачом. Для нас гэта было выйсце ў свой час. Муж — ваенны, у мяне таксама адказная работа, мы не маглі сабе дазволіць, скажам, два летнія месяцы праводзіць з дзецьмі. Таму стараліся адпраўліць хоць бы на адну змену ў лагер. Заўсёды прыязджалі на выхадныя, цікавіліся іх справамі. І калі сын у нас па жыцці вельмі камунікабельны, хутка знаходзіў сяброў, не меў наогул ніякіх праблем, то з дачкой было інакш. Аднойчы мы прыехалі і ўбачылі, што яе рэчы ляжаць у сумцы. Аказалася, што іншая дзяўчынка, з якой ім на дзвюх выдзелілі шафку, заняла яе цалкам. А наша Аня была настолькі ціхай, сціплай, што маўчала і трывала. Тады мы растлумачылі дачцэ, што трэба ўмець за сябе пастаяць, не саромецца зрабіць заўвагу, калі гэтага вымагаюць абставіны і здаровы сэнс. Думаю, што той вопыт усё ж пайшоў ёй на карысць, і яна атрымала жыццёвы ўрок. Яна тады з многімі пасябравала, змена прайшла ў цэлым цікава.

Цяпер збіраем у лагер унучку. Наша Аліса — дзяўчынка актыўная, баявая, не такая, як яе цётка некалі. Яна займаецца вывучэннем англійскай мовы на паглыбленым узроўні, і мы знайшлі лагер, у якім ёсць праграма з магчымасцю папрактыкавацца. Акрамя таго, спадзяёмся на добрае надвор'е, бо для адпачынку галоўнае — сонца, свежае паветра, фізічная актыўнасць.

Аліна ДАНІЛЬЧЫК:

— Для нашай шматдзетнай сям'і летнія лагеры — выйсце ў пытанні арганізацыі адпачынку. Мы з мужам выхоўваем пяцёра дзяцей, трое — школьнікі. На канікулах на працягу вучэбнага года яны ходзяць у школьны лагер. А летам мы адпраўляем іх у летнік. Гэта выгадна і матэрыяльна, бо прафкам па месцы работы мужа, як шматдзетнай сям'і, кампенсуе поўны кошт пуцёвак. Наш старэйшы сын Дзіма — васьмікласнік, ён ужо адпачываў у лагеры, чакае змену з задавальненнем. Яго настрой перадаўся і дочкам Веры і Надзі — яны збіраюцца, мы разам ужо хадзілі па крамах, выбіралі зручныя абутак і адзенне. Думаю, што дзецям спадабаецца адпачынак на свежым паветры. Для нас жа з'явіцца магчымасць крыху адпачыць ад напружанага графіка штодзённых клопатаў. З двума дашкольнікамі спраўляцца лёгка. А на апошні месяц лета, калі ў мужа будзе працоўны адпачынак, плануем паездку ў вёску да бацькоў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ БУДЗЕ МАЦНЕЦЬ, ЭКАНОМІКА — РАСЦІ

Выконваючы праграму па імпартазамяшчэнні, можна зарабіць сапраўды вялікія грошы

Хто б мог выказаць здагадку ў сярэдзіне сакавіка (тады курс долара ў камерцыйных банках быў каля чатырох рублёў), што літаральна праз два месяцы курс амерыканскай валюты апусціцца да адзнакі 2,5—2,6 рубля? Што не трэба шукаць замежную валюту, бегаючы па ўсім горадзе, а можна будзе проста, без чэргаў, набыць яе ў любым абменным пункце. Праўда, купіць не любую суму, а толькі тую, якую да цябе хтосьці прынясе і здасць. А людзі здаюць пастаянна.

Мы яшчэ тады пісалі ў газеце, што не варта паддавацца паніцы і купляць «чужыя паперкі» ў той час, калі банкамі выстаўляецца максімальная маржа пры куплі-продажы. А розніца паміж купляй і продажам валюты тады даходзіла да 40—60 капеек. Менавіта дзякуючы нашай паніцы ў гэты час банкі і зарабілі шалёныя барышы. Але час усё расставіў на свае месцы. Цяпер цікава ведаць, што будзе далей з нацыянальнай валютай і якія перспектывы нашай эканомікі...

ПРАПАНОВА ВАЛЮТЫ ПЕРАВЫШАЕ ПОПЫТ НА ЯЕ

Аналітыкі партала «Банкі Беларусі» лічаць, што беларускі рубель будзе і далей стаяць на моцных пазіцыях у адносінах да долара і еўра да таго часу, пакуль курсы гэтых валют зніжаюцца на Маскоўскай біржы. А гэта будзе адбывацца, пакуль улады Расіі не прымуць меры супраць умацавання рубля. Пакуль урад і Банк Расіі працягваюць проста назіраць за сітуацыяй, не спрабуючы спыніць умацаванне расійскага рубля, што прывяло да падзення курсу долара на Маскоўскай біржы 13 мая да 64,572 рубля за долар.

Як вядома, беларускі рубель ацэньваецца «ў звязцы» і ідзе за расійскім, таму курс долара на Беларускай валютна-фондавай біржы на мінулым тыдні апускаўся да 2,5008 рубля за долар (а сёння ён увогуле ніжэйшы, чым 2,5). Пры гэтым не толькі ў Расіі, але і на ўнутраным рынку нашай краіны прапанова валюты перавышае попыт на яе. Як паведамілі ў Нацыянальным банку, у красавіку жыхары Беларусі больш прадалі валюты, чым купілі — на 116,4 мільёна долараў. За чатыры месяцы гэтага года насельніцтва рэалізавала валюты ў чыстым выражэнні на 429,3 мільёна долараў. Актыўна прадавалі валюту рэзідэнты, таксама банкі і нерэзідэнты.

У КРАСАВІКУ ВАЛЮТУ ПРАДАВАЛІ ЎСЕ ЦІ АМАЛЬ УСЕ

Абвал курсаў долара і еўра да значэнняў, якія назіраліся да дэвальвацыі рубля ў сакавіку, прывёў у красавіку да продажу валюты насельніцтвам, прадпрыемствамі і банкамі Беларусі ў суме на 0,5 мільярда долараў за месяц.

У першую чаргу пастараліся суб'екты гаспадарання — рэзідэнты краіны: яны рэалізавалі валюты больш, чым набылі, на 154,2 мільёна долараў (у сакавіку яны больш купілі валюты на 274,1 мільёна долараў). Пры гэтым валавы аб'ём продажу валюты беларускімі прадпрыемствамі вырас у параўнанні з сакавіком на 141,6 мільёна долараў — да 2,167 мільярда долараў. Максімальнае значэнне для гэтага паказчыка ў бягучым годзе.

Купілі ж валюты прадпрыемствы на 286,7 млн долараў менш, чым у сакавіку. Гэта мінімальнае значэнне з мая 2021 года і крыху ніжэйшае за пакупку ў красавіку таго ж года. Тым не менш па выніках студзеня–красавіка 2022 года юрыдычныя асобы — рэзідэнты краіны валюты купілі больш, чым прадалі, на 327,3 мільёна долараў.

У красавіку рэзка скарацілася куплі валюты суб'ектамі гаспадарання — нерэзідэнтамі краіны: у 2,6 раза ў параўнанні з сакавіком — да 127,5 мільёна долараў. Пры гэтым нерэзідэнты прадалі валюты прыкладна на траціну менш — 242,9 мільёна долараў. Такім чынам, і на рынку здзелак з нерэзідэнтамі сітуацыя стабілізуецца. У чыстым выражэнні нерэзідэнты рэалізавалі валюты ў красавіку на 115,4 мільёна долараў. Гэта прыкладна ў два разы больш за той аб'ём, які яны прадавалі ў сярэднім у месяц да лютага гэтага года. У студзені–красавіку гэтага года суб'екты гаспадарання — нерэзідэнты рэалізавалі валюты больш, чым набылі, на 141,7 мільёна долараў.

Беларускія банкі і фінансавыя арганізацыі ў красавіку таксама сталі чыстымі прадаўцамі валюты, рэалізаваўшы яе на 94,6 мільёна долараў. Да гэтага на працягу пяці месяцаў запар яны былі чыстымі пакупнікамі валюты. Па выніках студзеня–красавіка яны яшчэ застаюцца такімі з чыстымі пакупкамі ў памеры 393,8 мільёна долараў. Такім чынам, у красавіку ўсе ўдзельнікі валютнага рынку рэалізавалі валюты на 480,6 мільёна долараў больш, чым набылі.

НАЙБЛІЖЭЙШАЕ ЗАЎТРА БУДЗЕ НЕ ГОРШАЕ

У маі сітуацыя наўрад ці прынцыпова змянілася. Да таго ж, мяркуючы па даных аб знешнім гандлі, у нашай краіне захоўваецца прыток валюты ад гэтай сферы дзейнасці. Як паведаміў **міністр эканомікі Беларусі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ**, сёлета ў першым квартале экспарт тавараў і паслуг вырас у гадавым выражэнні на 5 %, гэта значыць, на 500 мільёнаў долараў, а станоўчае сальда знешняга гандлю дасягнула максімальнай велічыні за ўсю гісторыю краіны і склала амаль 1 мільярд долараў.

Паводле ацэнак экспертаў Мінэканомікі, ВУП Беларусі ў студзені–красавіку бягучага года знізіўся не больш чым на 2 %, што ва ўмовах санкцый можна лічыць паспехам. Да таго ж, паведаміў міністр, Беларусь цалкам спыніла гандаль з Украінай. Але нашай краіне ўдаецца паступова перанакіраваць патокі тавараў у іншыя рэгіёны.

Пасол Беларусі ў Бразіліі Сяргей Лукашэвіч паведаміў, што наша краіна вядзе перагаворы аб аднаўленні паставак калійных угнаенняў на бразільскі рынак, дэманструючы гатоўнасць знізіць цану на ўгнаенні. Улічваючы, што цана на ўгнаенні цяпер на максімуме, ажыццявіць гэта будзе нескладана. Пры гэтым са студзеня да сакавіка бягучага года, гэта значыць, яшчэ да спынення экспарту, у Бразілію было пастаўлена 612 тысяч тон хлорыстага калію з Беларусі.

Мы таксама павялічваем экспарт сваіх тавараў у абыход прыбалтыйскіх краін і Украіны, у сувязі з чым растуць перавозкі грузаў па чыгунцы. Як паведамілі ў БЧ, па выніках студзеня—красавіка аб'ём экспартных кантэйнерных перавозак у краіне павялічыўся ў 1,3 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года і дасягнуў больш за 50 тысяч кантэйнераў у дваццаціфутавым эквіваленце.

Такім чынам, пакуль прыток валюты ў краіну захоўваецца. Гэта азначае, што беларускі рубель па-ранейшаму будзе прытрымлівацца за расійскім. У Расіі сітуацыя з рублём застаецца нявызначанай. Кіраўніцтва суседкі пакуль не спрабуе спыніць умацаванне расійскай валюты, таму захоўваюцца перадумовы для працягу гэтай тэндэнцыі.

Да таго ж у нашай краіне экспарцёры пачынаюць прадаваць валюту для выплаты падаткаў. Гэта стане чарговым фактарам па ўмацаванні нацыянальнай валюты.

БЕЛАРУСЫ ЗДАЮЦЬ МЕНШ ВАЛЮТЫ З-ЗА ПРАБЛЕМ... З БАНКАМІ

Беларускі рубель умацоўваецца на працягу цэлага месяца, пры гэтым менавіта цяпер насельніцтва здаваць валюту не вельмі спяшаецца. Тым часам варта адзначыць, што ўсё роўна нашы грамадзяне прадаюць валюты больш, чым купляюць, ужо дзясяты месяц запар.

Статыстыка Нацыянальнага банка паказвае, што аб'ём продажу валюты беларусамі падае ўжо трэці месяц запар і ў красавіку дасягнуў гадавога мінімуму. Калі раней насельніцтва здавала прыкладна па 1 мільярдзе долараў штомесяц, то цяпер продаж валюты злёгку перавышае 730 мільёнаў долараў. У чым прычына такога зніжэння?

Акадэмічны дырэктар BEROC Кацярына БАРНУКОВА лічыць, што на самай справе аб'ём продажу валюты ўпаў не так моцна. Асабліва на фоне моцных ваганняў курсу беларускага рубля ў люты–сакавіку. Звычайная рэакцыя беларускага рынку ў такіх сітуацыях — хуткі рост куплі валюты і зніжэнне продажу. Тое, што сітуацыю ўдалося хутка купіраваць, і беларускі рубель пачаў умацоўвацца, забяспечыла перавышэнне продажу валюты над купляй.

Што датычыцца падзення аб'ёмаў продажаў валюты, то тут іграе ролю некалькі фактараў. Цяпер істотная частка продажу валюты фізічнымі асобамі — гэта не столькі продаж валютных заначак, колькі паступленні валютных пераводаў з-за мяжы. Многія беларусы цяпер працуюць за мяжой і пераводзяць валюту сваякам. Але апошнім часам у банкаў пачаліся сур'ёзныя праблемы з такімі пераводамі. З часам людзі знойдуць альтэрнатыўныя спосабы перавода сродкаў у краіну і сітуацыя ў гэтым кірунку будзе выраўноўвацца: продаж валюты будзе расці, лічыць аналітык.

СЫХОД ЗАМЕЖНЫХ КАМПАНІЙ АДКРЫВАЕ НАМ НІШЫ НА ДЗЯСЯТКІ МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ

Намеснік міністра эканомікі Беларусі Юрый ЧАБАТАР паведаміў, што наша краіна актыўна распрацоўвае праграмы па імпартазамяшчэнні.

Паводле яго слоў, сумесна з расійскім бокам быў складзены спіс перспектыўных для работы сфер. За мінулыя з пачатку рэалізацыі праграмы паўтара месяца ўжо з'явілася больш чым 10 інвестыцыйных праектаў у такіх галінах, як сельскагаспадарчае машынабудаванне, аўтамабільная прамысловасць, нафтахімія, прыборабудаванне і іншых. Новыя планы запатрабуюць прыкладна 2,5 мільярда долараў у выглядзе інвестыцый.

Юрый Чабатар адзначыў, што для такіх праектаў плануецца выдаваць ільготныя крэдыты — адпаведная работа ў гэтым кірунку ўжо вядзецца з банкамі. А неўзабаве будзе апублікаваны спіс імпартазамяшчальнай прадукцыі, пад якую і будуць вылучацца сродкі.

Намеснік міністра таксама пазначыў аб'ёмы імпарту з краін, якія па палітычных меркаваннях спынілі пастаўкі ў Беларусь, — гаворка ідзе пра тавары на суму каля васьмі мільярдаў долараў. Аднак намеснік кіраўніка Мінэканомікі ўпэўнены, што дзякуючы гэтаму для айчынных вытворцаў адкрываюцца вялікія перспектывы.

«Паводле нашых ацэнак, толькі сыход кампаній па дрэваапрацоўцы і мэблевай прамысловасці адкрывае нішу ў 5–6 мільярдаў долараў, у харчовай прамысловасці — каля 17–20 мільярдаў долараў. Гэта значыць, на рынку маюцца неабмежаваныя магчымасці для разгортвання вытворчасцяў», — заявіў Юрый Чабатар.

Для таго каб заахвоціць беларускія прадпрыемствы і кампаніі больш актыўна асвойваць нішы, Мінэканомікі праводзіць спецыялізаваныя біржы, якія ўключаюць выезд на месца тэхнолагаў і канструктараў малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Такім чынам спецыялісты могуць абменьвацца інфармацыяй і прыходзіць да рэальных дамоўленасцяў.

У маі–чэрвені плануецца правядзенне падобных мерапрыемстваў і выстаў-кірмашоў на прадпрыемствах харчовай і дрэваапрацоўчай прамысловасці, а таксама на вытворчасці будматэрыялаў.

«Работу па імпартазамяшчэнні мы праводзім пастаянна, на сістэмнай аснове. Стаіць задача сёлета вырабіць імпартазамяшчальнай прадукцыі на 25 мільярдаў долараў, максімальна прыцягваем да гэтага ўсе катэгорыі прадпрыемстваў», — сказаў Юрый Чабатар.

Сяргей КУРКАЧ.

У ТЭМУ

У АЦЭНКУ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ВАЛЮТЫ ЎМЯШАЛАСЯ СІТУАЦЫЯ З ГАЗАМ

Як аказалася, кошт агульнай еўрапейскай валюты амаль што наўпрост залежыць ад умення розных краін еўразоны не прыслухоўвацца да сваіх суседзяў.

Спроба краін Еўрасаюза адмовіцца ад расійскіх нафты і газу пагражае рэгіёну рэцэсіяй, у сувязі з чым курс еўра абрынуўся ніжэй за ўзровень 1,05 USD/EUR і пагражае знізіцца да парытэту — 1 долара за еўра.

Асцярогі наконт рэцэсіі існавалі ўжо даўно, але 27 красавіка яны атрымалі новае абгрунтаванне: Газпрам спыніў пастаўкі газу ў Польшчу і Балгарыю, бо яны адмовіліся аплачваць газ у расійскіх рублях. Калі гэта адбудзецца і з іншымі краінамі Еўропы, то ЕС пагражаюць сур'ёзныя непрыемнасці, бо каля 40 % спажыванага там газу ён закупляе ў Расіі. Падобная перспектыва і прывяла да абвалу курсу еўра на рынку Форэкс да 1,05 долара, што адбылося ўпершыню з 2017 года.

Рэальнасць пагрозы рэцэсіі пацвярджаюць эканамічныя даныя. Так, апераджальны індыкатар спажывецкага даверу ў Германіі, які разлічваецца даследчай кампаніяй GfK, апусціўся да мінімальнага значэння за ўвесь час разлікаў і склаў мінус 26,5 пункта.

Зніжэнне курсу еўра спынілася толькі 29 красавіка, калі ён здолеў падняцца да 1,0548 долара. У гэты дзень стала вядома, што гарманізаваны індэкс спажывецкіх цэн (HICP) у еўразоне ў красавіку павялічыўся да 7,5 % з 7,4 % у сакавіку, а базавы індэкс вырас да 3,5 %, што нашмат перавысіла прагноз у 3,2 %. Акрамя таго, рост ВУП Германіі ў першым квартале бягучага года стаў вышэйшы за прагноз і склаў 3,7 %. Усе гэтыя звесткі павялічваюць верагоднасць больш рашучага ўзмацнення жорсткасці грашовай палітыкі Еўрапейскага цэнтрабанка, і эксперты чакаюць павелічэння яго ставак да канца 2022 года на 90 базавых пунктаў.

Тым не менш, на думку аналітыкаў, сітуацыя пакуль складваецца не на карысць еўра. Карстэн Бжэскі, галоўны эканаміст ING Germany, мяркуе, што курс еўра відавочна рухаецца да парытэту з доларам. У якасці прычын слабасці еўрапейскай валюты ён паказаў на смутныя эканамічныя перспектывы еўразоны і адрозненні ў грашова-крэдытнай палітыкі ў ЗША і Еўразоне.

А Каспар Хенсэ, старшы партфельны менеджар Bluebay Asset Management ў Лондане, лічыць, што эмбарга на пастаўкі расійскага газу можа прывесці еўрапейскую эканоміку да рэцэсіі раней, чым чакалася, што прывядзе да распродажу еўра, якое можа аслабець да 1,05 долара ці нават наблізіцца да парытэту.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
25 мая 2022 г. № 19 (655)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Наталля КАЧАНАВА:

«Важна, што на прадпрыемстве ёсць аб'ёмы работ і кантракты на 2023—2024 гады»

Фота БелТА.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава наведала Мінскі завод грамадзянскай авіяцыі № 407. Яна пазнаёмілася з работай прадпрыемства, перспектывамі развіцця і пытаннямі будаўніцтва новага цэха, таксама спікеру верхняй палаты парламента прадэманстравалі музейную экспазіцыю, а падчас сустрэчы з калектывам работнікі прадпрыемства задалі свае пытанні.

Мінскі завод грамадзянскай авіяцыі ў наступным годзе адсвяткуе 70-годдзе. Варта адзначыць, што ў 2018-м прадпрыемства пераехала на новую пляцоўку — з цэнтра сталіцы за яе межы, у раён Нацыянальнага аэрапорта. Па сутнасці, завод адбудаваны на новым месцы нанава. І калі старое прадпрыемства мела шэраг абмежаванняў, у тым ліку па даўжыні ўзлётна-пасадачнай паласы, вышыні ангара, што не дазваляла пашырыць колькасць тыпаў самалётаў, што абслугоўваюцца, то цяпер гэта адна з самых сучасных авіярамонтных вытворчасцяў у Еўропе.

Сёння завод спецыялізуецца на капітальным рамонце самалётаў тыпу ТУ-134, Як-40, Як-42, а таксама выконвае работы па аператыўным і перыядычным тэхнічным абслугоўванні паветраных суднаў ІЛ-76Т, ТД. Асноўныя віды работ — фарбаванне вонкавай паверхні, мадэрнізацыя радыёэлектроннага абсталявання, мадэрнізацыя інтэр'ера самалёта і падаўжэнне яго рэсурсу.

Наталля Качанава спачатку наведала вытворчыя цэхі, у прыватнасці пабудаваны па ўнікальнай тэхналогіі ангар, які выкарыстоўваецца для рамонту паветраных суднаў. Яе цікавіла наяўнасць заказаў на прадпрыемстве.

— Гэта завод з даўняй гісторыяй, і разам з тым у 2018 годзе ён літаральна пабудаваны нанава і сёння кантактуе досыць паспяхова. Важна, што гэта экспартаарыентаванае прадпрыемства, якое кантактуе з шэрагам краін свету. Тут сфарміраваўся выдатны калектыў, сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы. Гэта штучныя спецыялісты, якія пастаянна навучаюцца, перадаюць традыцыі. І вельмі важна, што сёння ў нялёгкіх умовах ёсць аб'ёмы работ, кантракты на 2023 і 2024 гады, прапрацоўваюцца і дадатковыя. Працай калектыў прадпрыемства забяспечаны, — падкрэсліла Наталля Качанава ў размове з журналістамі.

Таксама яна пацікавілася пашырэннем відаў работ па рамонце і абслугоўванні, адзначыла, што работа сумежных галін па імпартазамяшчэнні мусіць быць больш актыўнай.

— Ёсць пытанні, якія варта адрасаваць сумежным прадпрыемствам. Яны павінны больш актыўна працаваць па даручэнні Прэзідэнта наконт імпартазамяшчэння, — сказала спікер Савета Рэспублікі. — Магчыма, варта распрацаваць фарбы, якія можна было б выкарыстоўваць пры рамонце і абслугоўванні самалётаў. Трэба паглядзець, што можна зрабіць, каб тут быў больш шырокі цыкл рамонту і абслугоўвання самалётаў. Але трэба сказаць, тое, што сёння робіцца на прадпрыемстве, заслугоўвае ўсялякай пахвалы. Пра гэта сведчаць і водгукі заказчыкаў.

— Асноўны авіяпарк, які мы абслугоўваем, — штучны тавар, што не эксплуатуецца ў авіякампаніях. Гэта паветраны флот спецпрызначэння, які выкарыстоўваецца ў ваенных часцях міністэрстваў абароны Расіі, Казахстана, Таджыкістана, а таксама міністэрствах унутраных спраў, Расгвардыі. На кожны самалёт мы дамаўляемся асабіста з заказчыкамі. Яны ведаюць, што мы па праве можам і ўмеем гэта рабіць. Нас правярае аўдыт, глядзіць, наколькі адпавядаюць вытворчыя ўмовы ўсім патрабаванням. І, паводле іх заключэнняў, нараканняў няма, — расказвае **выконваючы абавязкі генеральнага дырэктара ААТ «Мінскі завод грамадзянскай авіяцыі № 407» Уладзімір ПЯКАРСКІ**.

Наталлю Качанаву цікавіла і заканчэнне будаўніцтва фарбавальнага цэха, якое дазволіць істотна пашырыць колькасць заказчыкаў на прадпрыемстве.

— Ёсць пытанні, якія неабходна вырашаць, у прыватнасці, завяршэнне будаўніцтва фарбавальнага цэха. Іх мы абавязкова абмяркуем ва ўрадзе, звернем асаблівую ўвагу ўсіх зацікаўленых.

Пра перспектывы ў сваю чаргу расказаў і кіраўнік прадпрыемства:

— Мы не спыняемся на названых тыпах самалётаў і працуем на перспектыву. У цяперашні час актыўна ўзаемадзейнічаем з распрацоўшчыкам расійскіх самалётаў Sukhoi Superjet, у прыватнасці сярэднемагістральнага вузкафюзеляжнага пасажырскага самалёта МС-21, праводзім навучанне супрацоўнікаў — з мая накіравалі дзве групы з 24 чалавек. На канец верасня — пачатак кастрычніка мусім выйсці на сертыфікацыю. А ў кастрычніку, мяркую, у нас з'явіцца першы самалёт Sukhoi Superjet. Гэта сучасны новы самалёт, іх выпушчана больш за 200, яны эксплуатуюцца ў грамадзянскіх авіякампаніях «Аэрафлот», «Расія».

На сустрэчы з працоўным калектывам Наталля Качанава расказала пра структуру Савета Рэспублікі і яго заканатворчую дзейнасць, адказала на пытанні работнікаў.

— Сёння ўсім, у тым ліку і кіраўніцтву, трэба працаваць аператыўна, разумець, дзе рынкі збыту тваёй прадукцыі, дзе будучыня кантракты, як загрузіць прадпрыемства. Гэта каманда, якая мусіць працаваць зладжана і дакладна, разумеючы не толькі рынак сваёй краіны, але і сусветны, ваша кіраўніцтва з гэтым добра спраўляецца, — рэзюмавала Наталля Качанава.

Алена КРАВЕЦ.

Члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у пасяджэнні МПА СНД

Расказваем самыя важныя навіны мінулага тыдня

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла пасяджэнне экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі. На парадак дня была вынесена актуальная для краіны тэма — арганізацыя сістэмы абыходжання з радыеактыўнымі адходамі. Удзельнікі пасяджэння зрабілі акцэнт на неабходных прававых умовах для фарміравання надзейнай сістэмы доўгачасовага захоўвання і захавання радыеактыўных адходаў, што забяспечвае радыяцыйную бяспеку краіны. Эксперты падтрымалі ідэю стварэння спецыяльна ўпаўнаважанай арганізацыі — нацыянальнага аператара па абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі — і вызначэння на заканадаўчым узроўні яе задач і функцый, а таксама крыніц фінансавання дзейнасці.

У рамках падрыхтоўкі да IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі Наталля Качанава з рабочым візітам наведала Гродзенскую вобласць. Спікер сустрэлася са старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам Каранікам і памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектарам па Гродзенскай вобласці Юрыем Караевым. Яны абмеркавалі пытанні арганізацыі форуму і наведалі аб'екты, дзе будуць праходзіць асноўныя мерапрыемствы.

Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ узяла ўдзел у пасяджэнні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па эканоміцы і фінансах, якое адбылося ў Санкт-Пецярбургу. Ключавы блок пытанняў быў прысвечаны мадэльнаму заканадаўству ў сферах лічбавізацыі і лічбавай эканомікі, падаткаабкладання, гандлю і іншаму. Таксама ўдзельнікі пасяджэння абмеркавалі прапановы ў праект Перспектыўнага плана мадэльнай заканатворчасці ў СНД на 2023 — 2025 гады. «Безумоўна, асноўны напрамак нашай работы ў рамках МПА СНД — збліжэнне і гарманізацыя заканадаўства дзяржаў-удзельніц. Базавы інструмент для гэтага — мадэльныя законы. На гэты час прынята каля 600 мадэльных законаў і іншых актаў. Нормы больш як 70 працэнтаў з іх былі імплементаваны ў заканадаўства краін, а яшчэ каля 10 працэнтаў змяшчае супадаючыя з нацыянальнымі законамі палажэнні. Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе. Супрацоўніцтва нашых парламенцкіх дэлегацый у МПА СНД можа быць прыкладам для парламентарыяў усяго свету, як выбудоўваць культурны дыялог на прынцыпах узаемнага даверу, павагі і суверэннай роўнасці, чаго так не хапае ў сучасным свеце, які хутка змяняецца», — падкрэсліла сенатар. Таксама Таццяна Рунец сустрэлася з генеральным сакратаром Савета МПА СНД Дзмітрыем Кабіцкім. Яны абмеркавалі пытанні распрацоўкі мадэльных законапраектаў у галіне эканомікі і фінансаў.

Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дасягненні мэт устойлівага развіцця Віктар ЛІСКОВІЧ узяў удзел у пасяджэнні Савета па ўстойлівым развіцці. Асноўная ўвага была прысвечана другому добраахвотнаму нацыянальнаму агляду Рэспублікі Беларусь аб выкананні Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця да 2030 года. Гэты агляд будзе прадстаўлены Беларуссю на Палітычным форуме па ўстойлівым развіцці ў штаб-кватэры ААН.

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, член Пастаяннай камісіі МПА СНД па сацыяльнай палітыцы і правах чалавека Аляксандр КАРПІЦКІ ўзяў удзел у пасяджэнні Пастаяннай камісіі МПА СНД па сацыяльнай палітыцы і правах чалавека. Парламентарыі абмеркавалі прапановы Пастаяннай камісіі ў праект Перспектыўнага плана мадэльнай заканатворчасці ў СНД.

Валерыя СЦЯЦКО.

БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ НЕ АДСТУПЯЦЬ АД МІЖНАРОДНЫХ ЭКАЛАГІЧНЫХ ДАГАВОРАЎ

Гэта адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ на адкрыцці І Міжнароднага маладзёжнага экалагічнага форуму Саюзнай дзяржавы. Гэтымі днямі ён праходзіць у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце.

«Ні Беларусь, ні Расія не адступяць ні ад адной канвенцыі, ні ад аднаго міжнароднага дагавора. Мы ўсё будзем выконваць, але гэта мусіць рабіць і ўвесь свет, — прызнаў сенатар. — Сёння кажуць: «Нам газ расійскі не трэба, нам энерганосьбіты з атамных электрастанцый не трэба. Будзем здабываць вугаль, будзем паліць і павялічваць выкіды». Дык дзе эколагі?».

Паводле яго думкі, эканоміка і экалогія павінны дапаўняць адна адну. «Калі будзе толькі экалогія, не будзе жыцця. І эканоміка, нягледзячы на экалогію, таксама спыніць існаванне. Менавіта вы праз інавацыі, тэхналогіі дасце краіне прадукт, які забяспечыць годнае жыццё і захавае біяразнастайнасць, прыродныя рэсурсы», — звярнуўся член Савета Рэспублікі да ўдзельнікаў цырымоніі адкрыцця.

Міхаіл Русы выказаў шкадаванне, што шмат міжнародных канвенцый, законаў у сферы навакольнага асяроддзя стала разбурацца ў апошні год. «Ва ўнікальным краі, Белавежскай пушчы, у сусветнай спадчыне ставіцца бетонная сцяна вельмі вялікімі аматарамі экалогіі, палякамі. «Зялёныя» ў Германіі, якія прыйшлі да ўлады, забыліся, што такое зялёная эканоміка. Таму ваш голас сёння найбольш важны, і ён павінен быць пачуты сусветнай супольнасцю», — сказаў ён маладым эколагам.

Сенатар падзякаваў арганізатарам за ідэю форуму і прапанаваў зрабіць яго штогадовым. Міхаіл Русы паабяцаў дапамагчы ў гэтым і адзначыў, што секцыя, прысвечаная экалагічнай тэматыцы, будзе і на маючым адбыцца Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

«Мы гатовыя падставіць плячо, папрасіць кіраўнікоў дзяржаў, кіраўнікоў Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі падтрымаць вашу ініцыятыву», — працягнуў Міхаіл Русы.

У Міжнародным форуме бяруць удзел студэнты і выкладчыкі з расійскіх і беларускіх профільных ВНУ — з Масквы, Новасібірска, Санкт-Пецярбурга, Пскова, Мінска, Віцебска і Магілёва.

Па праграме асноўныя мерапрыемствы запланаваны на базе Негарэльскага вучэбна-доследнага лясгаса БДТУ, дзе для студэнтаў пройдуць лекцыі, практычныя заняткі, валанцёрскія акцыі на экалагічную тэматыку.

Падрабязнасці праграмы расказаў **рэктар БДТУ Ігар ВОЙТАЎ**: «На працягу пяці дзён нам неабходна разгледзець пытанні, звязаныя з экалагічным лесавыкарыстаннем, развіццём лясной прамысловасці на аснове новых тэхналогій, выкарыстаннем авіякасмічнай інфармацыі і распрацоўкай геасэрвісаў для спадарожнікаў Зямлі. Мы будзем разглядаць пытанні, звязаныя з выкарыстаннем беспілотнай авіяцыйнай тэхнікі для лясной гаспадаркі, у тым ліку аэрадронаў. Гэта абсалютна новы кірунак, якога няма пакуль на тэрыторыі былога Савецкага Саюза. У нас вельмі добрыя распрацоўкі ў апрацоўцы і вывучэнні лясоў».

Паводле Ігара Войтава, форум таксама прысвечаны вырашэнню сусветных праблем, звязаных з кліматам, захаваннем біялагічнай разнастайнасці, прыродных комплексаў. «Пляцоўка БДТУ абрана ў сувязі з тым, што ўніверсітэт мае вялікую, 90-гадовую гісторыю вырашэння гэтых пытанняў на тэрыторыі былога Савецкага Саюза і сёння ў Беларусі», — дадаў рэктар.

Для моладзі арганізатары падрыхтавалі таксама выязныя экскурсіі — наведванне замкавага комплексу «Мір», Цэнтра экалагічнага турызму «Станькава». Урачыстае закрыццё форуму і падвядзенне вынікаў адбудзецца ў Негарэльскім лясгасе 26 мая.

Марыя ДАДАЛКА.

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

«ПРЫЦЯГНУЦЬ МЕСЦІЧАЎ ДА РАЗВІЦЦЯ СВАЙГО КРАЮ»

У Гродзенскай вобласці прыступілі да рэалізацыі праектаў, якія ініцыіраваны абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў

Работы вядуцца за кошт сродкаў Банка развіцця, які выдзеліў 100 тысяч рублёў на гэтыя мэты. Выдаткі размеркаваны паміж 14 пераможцамі. Такім чынам, у сярэднім на адзін праект прыходзіцца каля сямі тысяч рублёў. Сродкі неабходна асвоіць да канца лістапада.

Менавіта на гэтую акалічнасць падчас сустрэчы з пераможцамі конкурсу звярнуў увагу **старшыня Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў Анатоль НІКІЦІН.** Каб не было непаразумненняў, для заяўнікаў нават правялі невялікі фінансавы лікбез.

— Крыху грошы затрымалі, але яны прыйшлі, і сезон для іх асваення адпаведны, бо лета — галоўны будаўнік. За гэты час праекты можна рэалізаваць, а пры неабходнасці — папоўніць праектны бюджэт мясцовымі сродкамі ці выдаткамі ад спонсараў, — заўважыў Анатоль Нікіцін.

Фінансісты папярэдзілі, што сродкі мэтавыя і павінны выкарыстоўвацца непасрэдна на інфраструктуру і будаўнічыя матэрыялы. А вось інструменты і інвентар у расходныя артыкулы не ўваходзяць. Не прадугледжана траціць сродкі на ўзнагароджанні, прэміі ці заработную плату. Купляць абсталяванне лепш зыходзячы з канкурэнтнага кошту. Калі праект разлічаны на большае фінансаванне, трэба шукаць уласныя сродкі. Дагаворы будуць заключацца паміж асацыяцыяй і балансаўтрымальнікам тэрыторыі. Пераліченыя сродкі, напрыклад, у сельскі Савет ці УЖРЭП павінны пайсці толькі на дадзены праект. Мэтавае выкарыстанне правяраецца, у тым ліку, Дзяржканторам.

Усе гэтыя дэталі насамрэч даволі важныя, бо падобны конкурс у вобласці правадзіцца ўпершыню. Ён арганізаваны ў чэрвені мінулага года ў адпаведнасці з праектам Указа «Аб рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў». А ўжо праз некалькі месяцаў у адрас абласной конкурснай камісіі паступіла 104 заяўкі па самых розных кірунках. Гэта і стварэнне дзіцячых пляцовак і вулічных спартыўных комплексаў, і добраўпарадкаванне тэрыторыі, і захаванне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, і ачыстка прыродных вадаёмаў, і іншыя. Амаль трэцяя частка заявак паступіла з горада Гродна. У праектную дзейнасць актыўна ўключыліся ўсе раёны вобласці. Ініцыятывы зыходзілі як ад асобных дэпутатаў, так і сельскіх Саветаў, грамадскіх арганізацый, іншых устаноў. Камісія вызначыла 14 фіналістаў, чые праекты будуць рэалізоўвацца ў рамках конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў.

Акцэнт быў зроблены на вырашэнне сацыяльна значных пытанняў, рэалізаваць якія бярэцца самі грамадзяне. І ў гэтым галоўны сэнс конкурсу. Месцічы будуць прыцягнуты да развіцця свайго краю, добраўпарадкавання тэрыторыі, відавочна, што яны будуць цаніць сваю працу. Да таго ж важна стымуляваць актыўнасць жыхароў.

Старшыня камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ЖЭСа № 15 Гродна Людміла ПАЎЛЮЧЭНКА расказала, што падлеткі з іх двара даўно просяць спартыўныя трэнажоры. Маўляў, для малых пляцоўкі ёсць, а для старэйшых дзяцей няма. Раней стаялі турнікі, потым іх «спілавалі», на гэтым усё і зацихла.

— Адзін падлетак дайшоў да старшыні асацыяцыі, сказаў, што моладзь хоча займацца спортам, таму мы рашылі для іх стварыць такую спартыўную пляцоўку. Я доўга шукала ў інтэрнэце адпаведныя снарады. Нам падыдуць камбінаваныя турнікі з дошкай для адціскання, шчыты з кальцом для стрытбола, скалалазка, арэлі, для малодшых школьнікаў — спуск. Зараз вызначаемся з коштам, — паведаміла аб сваіх планах старшыня КТГС.

А вось на тэрыторыі ясляў-садка ў Гродне збіраюцца ўстанавіць метэастанцыю для назірання за надвор'ем. Аб'ект папоўніць экалагічную сцежку, дзе ўжо ёсць дарожка з прыродных матэрыялаў — шышак, каменьчыкаў і нават невялікіх бярвенняў. Ёсць птушыная сталоўка: дзеці кормяць птушак і назіраюць за імі, ёсць імправізаваны «дзікі лес». Гэту сцежку, па словах загадчыцы садка Алены Шуцікавай, тут пачалі рабіць два гады таму з дапамогай бацькоў. Купілі саджанцы, азелянілі. Летам дзеці выходзяць сюды для заняткаў. З'яўленне метэастанцыі значна папоўніць іх кругазор, лічыць куратар праекта.

Гаючы мінеральна-крынічны парк прапануе стварыць на тэрыторыі рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Гродзенская пушча» **кіраўнік грамадскага аб'яднання «Крыніца» Тэрэза БЕЛАВУСАВА.** Яна расказала, што за сродкі фонду прадугледжваецца правесці мерапрыемствы па абароне крыніц ад забруджвання, добраўпарадкаваць тэрыторыі, размясціць інфармацыйныя стэнды, указальнікі, творы рамеснікаў і народных майстроў. Увогуле, ёсць планы па арганізацыі турыстычных і краязнаўчых сцежак, веладарожак, аглядальных пляцовак і зон адпачынку.

Старшыня Любчанскага сельскага Савета Сяргей КАВЕЦКІ сумесна з дэпутатам сельскага Савета Алегам Бедункевічам выйшлі з ініцыятывай абсталяваць вясковы кірмаш для гандлю і правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў. Месцічы гатовы актыўна ўключыцца ў яго стварэнне.

— Праект даўно выспяваў. У пасёлку адсутнічае рынак, і людзям няма дзе разгарнуць сельскагаспадарчы гандаль. Раней мы рабілі гэта на плошчы, перакрывалі вуліцы, што патрабавала ўзгадненняў з ДАІ і стварала нязручнасці для кіроўцаў, — расказаў старшыня Любчанскага сельсавета. — Нядаўна на плошчы знесены аварыйны будынак былога Дома быту. І цяпер на гэтым месцы плануем зрабіць кірмаш. Пляцоўку агародзім. Там будзе не толькі рынак, але і месца правядзення розных культурна-масавых мерапрыемстваў. Да нас прыязджае шмат музычных калектываў. Ім будзе зручна выступіць, а слухачам — сабрацца іх паслухаць.

Да праекта далучыцца таксама райвыканкам, лясгас, мясцовае ЖКГ, сельскагаспадарчае прадпрыемства, зазначыў Сяргей Кавецкі. А пачнецца праект з асвоення сродкаў, якія выдзеліў Банк развіцця.

Дарэчы, першая ініцыятыва будзе мець працяг.

— Цяпер у нас у рабоце праект па рэалізацыі ініцыятыў на сродкі, якія выдзелены непасрэдна абласнымі ўладамі. Мяркуецца, што выдаткі на адзін праект будуць значна большыя, чым тыя, якія атрыманы ад Банка развіцця, — паведаміў Анатоль Нікіцін. — Цяпер асацыяцыя знаёміцца з тымі праектамі, якія прадстаўлены на абласны тур. Іх каля 20. Для рэалізацыі будзе абрана 4-5 праектаў, кожны з якіх атрымае да 50 тысяч рублёў. Гэта эксклюзіўныя праекты ў рэгіёне.

Па словах старшыні асацыяцыі мясцовых Саветаў, такія конкурсы мяркуецца праводзіць штогод, а да іх удзелу прыцягваць яшчэ больш людзей, каб абудзіць ініцыятыву месцічаў, зацікавіць людзей у справах сваіх тэрыторый. Фонд грамадзянскіх ініцыятыў дазволіць падтрымаць і стымуляваць ініцыятывы грамадзян, арганаў тэрытарыяльна-грамадскага самакіравання, сельскія Саветы, грамадскія арганізацыі.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

МЕСЦЫ ТРАГЕДЫЙ І ГЕРАІЗМУ

Па ініцыятыве сельвыканкама ўстаноўлены памятны знак каля царквы, якую спалілі акупанты

Па Хомску і навакольных вёсках вайна прайшлася даволі жорстка, у зямлі засталіся ляжаць тысячы ахвяр. Кожны з помнікаў у аграгарадку і ваколіцах захоўвае трагічную старонку гісторыі. Да гэтага года быў яшчэ адзін не зусім звычайны помнік, каля якога спыняліся школьныя экскурсіі, да якога падводзілі старыя ўнукаў. Рэч пра дрэва на могілках вёскі Старамлыны. У вайну гэтае дрэва акупанты зрабілі назіральным пунктам, абсталявалі на ім кулямётнае гняздо. Такім чынам яны ахоўвалі мост ад магчымых партызанскіх дыверсій.

Памятны знак на месцы царквы.

Чырвона-бурая рака

На дрэве больш за 70 гадоў тырчалі цвікі, якія служылі прыступкамі для кулямётчыка. Ён залазіў наверх і страляў без папярэджання, калі нейкі рух падаваўся яму падазроным. Пад абстрэл траплялі рыбакі на рацэ, позніе падарожныя, усе, хто не ведаў пра агнявы пункт. Дрэва давялося знесці нядаўна па прычыне аварыйнасці, бо яно магло ў любы момант упасці і нарабіць клопату. Але многія ў вёсцы памятаюць пра яго і могуць расказаць. Памяць тут захоўваюць беражліва.

У Хомскай сярэдняй школе працуе гурток краязнаўства пад кіраўніцтвам настаўніцы Людмілы Шыкулы. Людміла Рыгораўна разам з вучнямі і калегамі сабрала ўнікальны матэрыял. Работа па гісторыі населенага пункта са старажытнага часу ўяўляе сабой, па сутнасці, добрую манаграфію памерам больш чым на 100 старонак. Яна ўтрымлівае ўспаміны і сведчанні рэальных людзей, якія жылі альбо дагэтуль жывуць у вёсцы. Цяпер, як выглядае, гэтыя звесткі бясцэнныя.

На ўскраіне Хомска стаіць сціплы абеліск. Ён устаноўлены на месцы пахавання больш за дзвюх тысяч яўрэяў. Іх забілі адразу пасля акупацыі — 2 жніўня 1941 года. Людзі не паспелі ачомацца, зразумець, што адбываецца. Людміла Шыкула запісала сведчанне жыхаркі Хомска 1925 года нараджэння Вольгі Кугач:

— У Хомск тады з боку Кобрына прыехала каля 150 нямецкіх кавалерыстаў на адкормленых шэрых конях. Вершнікі былі ў пярэстых накідках. Найперш размясціліся па кватэрах. А нараніцу прыступілі да «справы». Спачатку сабралі яўрэйскіх мужчын і зачынілі іх у будынку сінагогі. Мы яшчэ спалі, калі пастукалі да нас у акно. Зайшоў салдат. Спытаў, ці ёсць у доме «юдэн». Прайшоў па ўсёй хаце, штыком праверыўшы месцы пад ложкамі, у падпечку. Мы стаялі і трэсліся. Потым сышоў. У вокнах мы ўбачылі калону яўрэйскіх жанчын з дзецьмі, якіх гналі немцы. Маленькіх дзяцей жанчыны неслі на руках, а старэйшыя ішлі, трымаючыся за матуліны спадніцы.

Потым прывезлі сюды вялікую групу яўрэйскага насельніцтва з Шарашэва Пружанскага раёна. Расстрэльвалі людзей партыямі. Старажылы ўспаміналі, як тутэйшыя паліцэйскія расказвалі ім: пасля расстрэлу чарговай партыі карнікі выпівалі па чарцы шнапсу і весела смяяліся.

Канаву, якую адвялі пад брацкую магілу, засыпалі зямлёй. Пасля дажджу побач збіралася вада, дык людзі казалі, што яна была чырвона-бурая ад крыві. А потым прайшлі навальніцы, вада ў рацэ выйшла з берагоў, і па рацэ паплылі трупы дзяцей...

Да помніка той трагедыі не раз прыязджалі сваякі людзей, якія там пахаваны. Першая вялікая дэлегацыя гасцей з Ізраіля пабывала ў Хомску ў 1991 годзе.

Работа па гісторыі населенага пункта са старажытнага часу ўяўляе сабой, па сутнасці, добрую манаграфію памерам больш чым 100 старонак. Яна ўтрымлівае ўспаміны і сведчанні рэальных людзей, якія жылі альбо дагэтуль жывуць у вёсцы. Цяпер, як выглядае, гэтыя звесткі бясцэнныя.

Помнік партызану Макарэвічу.

Юны камандзір

А тады, у 41-м, зверствы фашыстаў падштурхоўвалі людзей аб'ядноўвацца і супрацьстаяць агрэсару. Ваеннапалонныя, якім удалося ўцячы, вайскоўцы, якія адсталі ад часцей і заставаліся ў вёсках, мясцовыя жыхары, стваралі невялікія падпольныя групы і рыхтаваліся да партызанскай барацьбы. З пачатку 1942 года ў ваколіцы ўжо дзейнічалі партызанскія атрады.

Яшчэ адзін помнік у Хомску стаіць на ўзвышшы, да яго вядуць крутыя прыступкі. Надпіс гаворыць, што помнік пастаўлены афіцэру, лейтэнанту Чырвонай Арміі. На здымку — твар амаль дзіцячы. І не дзіва, гады жыцця лейтэнанта 1921—1943. Яўген Макарэвіч родам з Хомска. Перад самай вайной скончыў ваеннае вучылішча, у вайсковую часць трапіў, можна сказаць, пад першыя залпы вайны. І адразу — адступленне, акружэнне, так аказаўся ў родных мясцінах. Стаў збіраць вакол сябе аднадумцаў, арганізаваў партызанскі атрад. У рабоце хомскіх краязнаўцаў выкарыстаны ўспаміны камандзіра партызанскай брыгады імя Сталіна Брэсцкага злучэння Сумбата Арзуманяна. Ён згадваў юнага камандзіра як бясстрашнага і разам з тым талковага вайскоўца, які карыстаўся вялікім аўтарытэтам у партызан. Яго атрад называлі "жэнькаўцы", па імені камандзіра, які ўмеў трымаць вайсковую дысцыпліну, меў добрыя арганізатарскія здольнасці. За нейкі год "жэнькаўцы" паспелі правесці шэраг удалых баявых аперацый, стварылі разведку. Камандзір потым па-геройску загінуў у баі, і атрад атрымаў яго імя ўжо афіцыйна. У данясеннях брыгады паведамлялася, што атрад Макарэвіча некалькі разоў папярэдзіў гібель мірнага насельніцтва ў тутэйшых вёсках. А вось яго родную вёску Хомск лёс не пашкадаваў.

Расстрэл каля храма

Тое, што многія жыхары Хомска ў партызанах, было вядома акупантам. Больш за тое, народныя мсціўцы праводзілі дастаткова дзёрзкія аперацыі, аднойчы, напрыклад, зладзілі налёт на паліцэйскі ўчастак у вёсцы, забралі зброю і боепрыпасы... Пра тое, што карны атрад рушыў з Драгічына ў бок Хомска, стала вядома ў ваколіцы. Шмат жыхароў падалося ў лес. Дома заставаліся пераважна жанчыны і дзеці ў спадзяванні, што іх не будуць чапаць. Гэта было 5 ліпеня 1943 года. Акупанты сагналі ўсіх, каго засталі, у цэнтр вёскі. Людзі, іх было 170 чалавек, спадзяваліся, што царква стане для іх паратункам. Але храм падпалілі. Усіх, хто выбягаў, расстрэльвалі. Брацкая магіла ўтварылася на месцы расстрэлу, тут пахаваны астанкі 86 чалавек. У 1965 годзе на гэтым месцы адкрылі помнік. Ён стаіць і цяпер, памянялі толькі мемарыяльную дошку.

Школьнікі каля помніка забітым землякам.

— Царква наша была асаблівая, — расказвае **старшыня Хомскага сельскага Савета Аляксандр ЗАВЕРАЧ.** — Унікальны помнік архітэктуры ў стылі класіцызму, аналагаў якому застаюцца адзінкі ў Еўропе. Храм быў узведзены ў 1800 годзе Войцехам Пуслоўскім, уладальнікам знакамітага Косаўскага палаца і мястэчка Хомск. Царква была двухпавярховая, цагляная. Круглая купальная ратонда з трох бакоў выдзялялася порцікамі з трохвугольнымі франтонамі, пад якімі былі зроблены ўваходы ў храм. Па крузе размяшчалася каланада, якая трымала купальнае скляпенне.

Час збіраць камяні

І тым не менш, царкву падпалілі. Але згарэла яна не цалкам. Даволі трывалыя сцены засталіся. Пасля вайны тут праводзілі богаслужэнні. А ў 1952 годзе прыхаджане разам са святаром напісалі прашэнне аб дапамозе ў аднаўленні храма і накіравалі ў Пінскі аблвыканкам. Быў нават складзены каштарыс. Палову сумы абавязваліся сабраць вяскоўцы, прасілі выдзеліць другую палову. Аўтары ліста пісалі, што будынак даволі добра захаваўся і яго нескладана аднавіць. Протаіерэй Мікалай Дрылеўскі ад сябе дадаваў, што насельніцтва вызначаецца рэлігійнасцю, мае патрэбу ў храме, а яшчэ вялікае значэнне мае памяць пра трагедыю, якая тут адбылася. Але пісьмо іх засталося без адказу. Затое ў 1964 годзе з'явілася рашэнне Драгічынскага райвыканкама аб перадачы будынка царквы для выкарыстання ў культурна-бытавых мэтах калгасу імя Кірава. Гаспадарка пачала разбіраць храм на цэглу, канчаткова помнік архітэктуры быў разбураны ў 1972 годзе.

Вяскоўцам удалося схаваць хіба звон і адзін з крыжоў храма. Гэты звон быў ахвяраваны царкве заможным жыхаром вёскі Іванам Аніська ў 1930 годзе. Пра тое, як удалося захаваць рэліквію, існуе цэлая дэтэктыўная гісторыя. Звон хавалі на падворках, у гаспадарчых пабудовах, доўгі час трымалі нават у балоце, але выратавалі. Потым звон часова перадалі царкве ў Бездзежы, а ў 1991 годзе вярнулі назад у Хомск.

А вось крыж знайшлі выпадкова. Гаспадар аднаго з дамоў клапатліва схаваў святыню, потым памёр ды забраў сваю таямніцу з сабой. Праз шмат гадоў пры разборцы жытла крыж знайшлі і палічылі гэта знакам, што прыйшоў час збіраць камяні.

У 2018 годзе на месцы царквы з'явіўся памятны знак, які ўтварылі крыж, камень і звон. Мемарыяльная шыльда расказвае аб унікальным помніку архітэктуры, а на другой адлюстравана выява царквы, якой больш няма і якая памятала прыгожыя святы, урачыстыя богаслужэнні, а таксама жудасныя імгненні знішчэння мірных людзей. Цяпер падчас усіх памятных дат да помнікаў прыходзяць нашчадкі, укладваюць кветкі, згадваюць тых, хто аддаў за радзіму, і тых, хто стаў нявіннымі ахвярамі вайны.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Драгічынскі раён.

ВЯСКОЎЦЫ ЧАКАЮЦЬ КАЛОДЗЕЖ

Хто дапаможа аднавіць драўляны навес на агульным аб'екце?

Вось ужо амаль год жыхары вёскі Коматава Гродзенскага раёна звяртаюцца ў мясцовы сельвыканкам з просьбай адрамантаваць калодзеж. На першы погляд, сітуацыя не такая праблемная, бо аб'ект невялікі — усяго толькі зрабіць навес. А між тым для вяскоўцаў ён важны, бо многія карыстаюцца менавіта гэтай вадой.

Фота Мікалая ЛАПІНА.

Сапраўды, калодзеж патрабуе рамонту. Асабліва — навес, праз які відаць неба. Па словах **старасты Тамары КУЗЬМІЦКАЙ**, калодзежы ў вёсцы яшчэ даваенныя. На некаторых падворках ёсць свае, уласныя, але не ва ўсіх. Таму частка вяскоўцаў карыстаецца агульным. Магчыма, ён абнаўляўся, бо аснова яшчэ моцная — і драўляная абшыўка, і слупы, і калаўрот. А вось накрыўка і навес знасіліся. Накрыўку вяскоўцы адрамантавалі самі — збілі некалькі дошак, выраўнавалі і паклалі на калодзеж замест старой, каб у ваду не трапляла лісце і ападкі. А вось навес без спецыяльнай падрыхтоўкі і будаўнічых матэрыялаў не асіліць.

— Ва ўсіх вёсках такія калодзежы за кім-небудзь замацаваны, а ў нас даваенныя, яны ні на чыім балансе не лічацца, таму і адрамантаваць іх складана, — адзначыла староста.

Наступны адказ жанчына атрымала ў мясцовым сельсавеце. Маўляў, гэта адкрытая крыніца для карыстання, хто-небудзь ваду забрудзіць, а адказваць прыйдзецца сельвыканкаму. Агучваўся і такі варыянт — засыпаць калодзеж, каб закрыць пытанне.

Аргументы слушныя, але і людзей можна зразумець. Калодзеж для некаторых вяскоўцаў — адзіная водная крыніца, іншай у іх няма. Таму на крайні варыянт людзі не пагадзіліся.

Дапамогу ў мясцовай гаспадаркі жыхары пакуль не прасілі. Ды і ў сельвыканкаме не сталі падключаць СВК — і без таго часта звяртаюцца да кіраўніцтва па дапамогу. Такім чынам, «калодзежнае» пытанне пачало прабуксоўваць, у асноўным — з-за адсутнасці аб'екта на чыім-небудзь балансе.

Але месцічы не супакоіліся. Знайшлі на калодзежы інвентарны нумар. Аказалася, што аб'ект усё ж такі лічыцца на балансе сельскага Савета, праўда, як дэкаратыўны. Прасцей кажучы, гэта малая архітэктурная форма, рамантаваць якую за бюджэтныя сродкі не забаронена.

— У сельсавеце мне сказалі, што ёсць і спонсар для такой мэты, — паведаміла Тамара Кузьміцкая. — Але калі ён распачне работу, невядома. Нібыта гэта дорага, бо аб'ект няпросты. Але ж калі паабяцалі, значыць, зробяць. Вось мы і чакаем.

А што з якасцю вады? Ці правяраюць калодзеж санітарныя службы? Староста адказала, што вельмі рэдка, хацелася б, часцей.

Сапраўды, як ажыццяўляецца праверка вады ў грамадскіх калодзежах?

У аддзеле камунальнай гігіены Гродзенскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі маё пытанне выслухалі і параілі адправіць пісьмовы запыт кіраўніцтву цэнтра. Магчыма, яго разгледзяць і дадуць пісьмовы адказ. Але гэта ўжо будзе іншая тэма — пра якасць пітной вады.

ЦІ БУДЗЕ МЕСЦА ПАД СОНЦАМ?

Жыхаркі аграгарадка Верцялішкі дабіваюцца ўладкавання гандлёвай зоны

Як хутка жанчыны змогуць рэалізаваць сваю агародніну, пакуль невядома. Але ім прыйшлося звярнуцца ў розныя інстанцыі — ад райвыканкама да раённай газеты. І ўсё ж вырашэнне праблемы прыпынілася, хоць райвыканкам вынес сваю рэзалюцыю яшчэ два гады таму.

Дазвол на размяшчэнне гандлёвых месцаў існаваў з 2020 года. Менавіта тады Гродзенскі райвыканкам прыняў рашэнне аб уладкаванні месцаў для рэалізацыі тавараў, якія не адносяцца да прадпрымальніцкай дзейнасці. Быў вызначаны і канкрэтны адрас: вуліца Савецкая, 20. Але прадаваць там сваю агародніну мясцовым жыхарам не ўдавалася, бо з гэтым месцам не пагадзіліся ў сельвыканкаме. Маўляў, гандлёвыя рады будуць размешчаны каля будынка (а гэта былы ўнівермаг), які займеў новага гаспадара. Наўрад ці яму спадабаецца такое суседства. Да таго ж прыватны гандаль, лічаць у сельвыканкаме, не пасуе знакамітаму населенаму пункту. У якасці кампрамісу прапанавалі новы адрас — мясцовы парк. Пры гэтым ніякіх гандлёвых радоў там не прадугледжвалася. Людзі маглі гандляваць на сваіх «прылаўках» альбо наогул «з зямлі», што недапушчальна па санітарных нормах. Такая пазіцыя выклікала незадаволенасць з боку жыхароў.

Як паведамілі ў Верцялішкаўскім сельвыканкаме, праблема не толькі ў згодзе мясцовай улады. Таму да яе вырашэння далучыўся шэраг службаў райвыканкама. Здаецца, выхад знайсці ўдалося. У раённай газеце «Перспектыва» нядаўна была апублікавана план-схема месца гандлёвай зоны. Як адзначылі ў сельвыканкаме, згодна з новымі нарматыўнымі дакументамі яны не могуць распараджацца сваімі сродкамі, хоць павінны выступаць як заказчыкі. Цяпер шукаюцца магчымасці для фінансавання дадзенай інфраструктуры. Наколькі зацягнецца вырашэнне пытання, невядома.

А жадаючых стаць за прылавак нямала. Толькі не за імправізаваны, а за сучасны, варты прапанаванай добрай прадукцыі.

КУДЫ ДЗЕЦЬ СМЕЦЦЕ?

Адсутнасць кантэйнераў вымушае людзей засмечваць наваколле

З такой праблемай прыйшлося асабіста сутыкнуцца падчас наведвання могілак у вёсцы Берштоўшчынскага раёна. Паўстала пытанне: куды выносіць смецце? І калі траву ды галлё неяк можна скласці на ўскрайку лесу, то як быць з пластыкам? Аказалася, што вакол могілак утварылася некалькі стыхійных звалак.

Кантэйнеры раней стаялі. Калі яны зніклі, невядома, толькі апошнія гады іх тут няма. Затое ёсць кучы смецця, якія выраслі якраз каля шыльды аб забарону яго складзіраваць. Але куды яго несці? Не дамоў жа...

Дык чаму тут няма кантэйнераў? Як паведаміла **старшыня Астрынскага сельвыканкама Наталля ЛЕБЯДЗЕВІЧ**, мясцовая ўлада неаднаразова звярталася ў раённую жыллёва-камунальную гаспадарку з просьбай устанавіць кантэйнеры ля могілак. Але там нічога не абяцаюць з-за недахопу сродкаў.

Кантэйнерныя пляцоўкі ёсць толькі ля пагоста ў цэнтры сельсавета — Астрына. Іх там нават некалькі. Што датычыцца Берштаў, тут арганізаваны рэгулярны вываз смецця жыллёва-камунальнай службай.

Але навошта ставіць шыльду аб забароне, калі адтуль смецце вывозіць?

Здаецца, можно было б адвесці пад гэтыя мэты пэўны ўчастак і неяк яго вызначыць на мясцовасці. Сапраўды, у некаторых населеных пунктах сельскага Савета ёсць пляцоўкі для смецця каля могілак. Гэта тры бетонныя сценкі з цэментнай падлогай. Але з такіх пляцовак, як высветлілася ў гутарцы, камунальнікам складана вывозіць смецце.

— З аднаго боку, санітарныя нормы быццам бы выкананы, але з другога, з тэхнікай немагчыма і падступіцца да смецця і грузіць яго трэба ўручную. А вось стыхійныя кучы «Амкадору» грузіць зручна, — патлумачыла старшыня сельвыканкама. — Як правіла, больш смецця збіраецца ў дні масавага наведвання могілак, напрыклад, на Радаўніцу. І ў Берштах, я ведаю, людзі разам са старастам чысцяць тэрыторыю, высякаюць кусты. Іх альбо спальваюць, альбо складзіруюць для вывазу.

Сапраўды, расліннае смецце, напрыклад, тыя ж карчы і галіны, можна проста спаліць. Гэта не забараняецца, паведамілі ў абласным упраўленні МНС. Рабіць тое трэба на бяспечнай адлегласці ад будынкаў і ляснога масіву ў бязветранае надвор'е, абкапаўшы месца вогнішча. Можна выкарыстоўваць металічную бочку, гэта яшчэ больш бяспечна. Ва ўсякім разе, такі падыход дазволіць значна мінімізаваць колькасць смецця. А пластмасавыя вырабы — скласці ў мяшкі і чакаць прыезду пагрузчыка. Для старасты і вяскоўцаў задача нескладаная, а вынік будзе відавочны.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 24 мая 2022 года.**

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 13 июня 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
«Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники» с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212
Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17
Начальная цена – 583 040,40 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка – 58 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **13 июня 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 26.05.2022 по 09.06.2022 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»)

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 420/С-57755 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание оптового склада), площадью 372 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Качана, 1Г;
- капитальное строение, инв. № 420/С-44997 (назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – база МУ), площадью 415,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Качана, 1В;
- капитальное строение, инв. № 420/С-100709 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – площадка с северной стороны оптового склада с подъездной дороги 1 очереди), площадью 1080,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Качана, площадка с северной стороны оптового склада с подъездной дороги 1-й очереди;
- охранно-пожарная сигнализация оптового склада

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 423650100009000138, площадью 0,4637 га (назначение – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Качана, 1В. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадью 0,0136 га

Начальная цена продажи лота – 228 019,20 руб. (двести двадцать восемь тысяч девятнадцать рублей двадцать копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 22 801 руб. (двадцать две тысячи восемьсот один рубль)

Продавец – открытое акционерное общество «Лакокраска» г. Лида, 231300, г. Лида, ул. Игнатова, 71. Тел. 8-0154-53-84-30, факс 8-0154-53-85-92

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона: возмещение затрат Продавца на проведение независимой оценки имущества в размере 720,72 руб. с учетом НДС; возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 0,6 % от конечной цены продажи объекта.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов. Условия оплаты – по договоренности сторон

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833220 05001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 14 июня 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 06.04.2022 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 10 июня 2022 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by**
Продавец	**ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов, назначенных на 08.06.2022 г.

Лот №	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
	Спецтехника, расположенная по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, д. Хоростово	
1	Опрыскиватель «Харди Коммандер Плюс», заводской № 007332, 2000 г. в.	5065,86 бел. руб.
2	Пресс-подборщик «Клаас Квадрант 1150» заводской № 04500237, 2001 г. в.	5 780,88
3	Сеялка кукурузная «Кляйне Мультикорн 6 р» заводской № 16-С40-012, 2000 г. в.	4 598,58
	Спецтехника, расположенная по адресу: г. Орша	
4	Прицепный Опрыскиватель «Амазоне UX 5200», заводской № ГЧ00000657, 2008 г. в.	13 822,36

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 02.04.2022 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 08.06.2022 г. с 10.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Дата и время окончания приема заявок: по 06.06.2022 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Предмет электронных торгов, назначенных на 29.06.2022 г.

Лот №	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
5	**3/4 доли в праве общей долевой собственности на капитальное строение** (здание нежилое), инв. номер 333/С-15, общая площадь 599,2 кв. м. Адрес: Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Куйбышева, 46	280 389,67
6	**3/4 доли в праве общей долевой собственности на капитальное строение** (здание нежилое), инв. номер 333/С-635, общая площадь 107,3 кв. м. Адрес: Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Куйбышева, 46	14 218,06

Сведения о земельном участке с кадастровым номером 322350100003000395: предоставлен на праве аренды по 27.05.2053 г. общей площадью 0,2552 га (доля в праве 3/4) для размещения объектов промышленности

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 29.06.2022 г. с 10.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Дата и время окончания приема заявок: по 27.06.2022 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, **получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1,8 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

ГОМЕЛЬСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
извещает о проведении 27 июня 2022 г. в 11.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – склада ОМТС, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Житковичский моторостроительный завод» на праве собственности

Лот № 1: склад ОМТС, инв. № 332/С-456518. Адрес объекта: Гомельская обл., Житковичский р-н, Рудненский с/с, 31, Склад ОМТС, 1,3 км западнее г. Житковичи. Назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ. Одноэтажное сооружение, год постройки 1980. Общая площадь (протяженность) 629,7 кв. м Составные части и принадлежности: навес, площадка для хранения металла, ворота

Начальная цена лота: 76 560,00 рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 200,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Земельный участок для обслуживания здания склада ОМТС **на праве аренды** сроком **по 26.03.2121 г.**, площадью **1,8323 га,** с кадастровым номером **321650100001001290.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 24 июня 2022 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 10.00 до 11.00 **27 июня 2022 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 25.05.2022 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 3 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке в течение 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта

Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23.
тел. 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47. Сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@gino.by
Продавец: ОАО «Житковичский моторостроительный завод», Гомельская обл., г.Житковичи. т. 8 (02353) 2-98-45, 8 (044) 585-22-17

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
ОАО «СЛОНИМСКИЙ ВОДОКАНАЛ»

Предмет торгов, краткая характеристика			
Лот № 1 – капитальное строение с инв. № 450/С-18838 (здание нежилое) с пристройкой и террасой, кирпичное, 2 этажа, 1953 г. п., площадью 240,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 425450100001007537 площадью 0,0988 га для обслуживания здания, право постоянного пользования (местонахождение – Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Советская, д. 7); **пожарная сигнализация** на базе ПКПА-6-06; **аппарат отопительный газовый бытовой** марки АОГВК-23,2-1			
Начальная цена с учетом НДС	**71 747, 21 рублей**	**Сумма задатка (5 %)**	**3 587,00 рублей**
Торги состоятся 24 июня 2022 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8			
Срок подачи документов: по 20 июня 2022 года до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8			

Аукцион без условий. Шаг аукциона – 5 процентов. **Сведения о продавце:** ОАО «Слонимский водоканал», 231800 Гродненская обл., г. Слоним, ул. Пушкина, 120, тел. 8 (01562) 66803. **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, счет BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 календарных дней после проведения торгов. **Условия оплаты:** в течение 30 календарных дней с момента подписания договора. Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by. Более подробная информация по тел. в Гродно 8 (0152) 621632.

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Предметы торгов	Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	Размер задатка, руб.
Лот № 1: кран башенный КБМ-401П, год выпуска 2010 г., заводской номер 355, инвентарный номер 9176 с комплектов противовесов: 8 шт. х 2,4 куб. м, 2 шт. х 0,876 куб. м, инвентарный номер 8063-4	71 160,00	7 116,00
Лот № 2: кран гусеничный специальный МКГС-32, год выпуска 2010 г., заводской номер 017, инвентарный номер 9153	93 600,00	9 360,00

Продавец: УСП «СПМК-35» ОАО «Пинскоблсвхозстрой», 225730, Брестская обл., Пинский р-н, д. Пинковичи, ул. Железнодорожная, 3, тел./факс 80165 37 09 91. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона не позднее 24 июня 2022 г. 17.00. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведен

Аукцион состоится 27 июня 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 24 июня 2022 г. до 17.00

Пласты гісторыі

МАЛОЧНЫ ЗУБ СПАТЫКНЕННЯ

Адкрыццё, якое змяняе ўяўленне аб жыцці неандэртальцаў і Homo sapiens

Яно можа азначаць, што наш від з'явіўся ў Еўропе нашмат раней і што неандэртальцы і Homo sapiens маглі суіснаваць у Еўропе больш за дзесяць тысяч гадоў. У Францыі знайшлі пячору, у якой жылі і неандэртальцы, і нашы продкі. Знойдзеныя там закамянеласці сведчаць, што неандэртальцы не вымерлі пасля прыходу Homo sapiens з Афрыкі ў Еўропу, а суіснавалі з сучаснымі людзьмі на працягу некалькіх тысячагоддзяў.

Археолагі больш за 30 гадоў старанна прасейвалі пласты глебы ўнутры пячоры Мандрэн, якая знаходзіцца за 140 кіламетраў на поўнач ад французскага горада Марсель. Чым глыбей яны капалі, тым далей у мінулае маглі зазірнуць. Здзіўленню навукоўцаў не было мяжы, калі яны выявілі малочны зуб дзіцяці Homo sapiens у пласце, датаваным прыкладна 54 тысячы гадоў таму, калі ў пячоры ўсё яшчэ павінны былі жыць неандэртальцы. У гэтым жа пласце былі знойдзены каменныя прылады, якія не маглі быць зроблены неандэртальцамі.

Выяўленне дзіцячага зуба і каменных прылад у гэтай пячоры дазваляе выказаць здагадку, што Homo sapiens жылі ў Заходняй Еўропе каля 54 тысяч гадоў таму. Гэта на некалькі тысяч гадоў раней, чым лічылася спачатку.

«Цяпер мы можам даказаць, што Homo sapiens прыбылі ў Еўропу на 12 тысяч гадоў раней, чым мы думалі. Гэта літаральна перапісвае ўсе нашы кнігі па гісторыі», — сказаў прафесар Людовік Слімак з Універсітэта Тулузы, які сумесна з вучонымі з Аўстраліі, Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Іспаніі, ЗША, Францыі і Швейцарыі даследаваў матэрыялы, выяўленыя ў ходзе раскопак пячоры Мандрэн.

Неандэртальцы з'явіліся ў Еўропе яшчэ 400 тысяч гадоў таму. Паводле цяперашняй тэорыі, яны вымерлі каля 40 тысяч гадоў таму, неўзабаве пасля таго, як Homo sapiens прыбылі на кантынент з Афрыкі. Але новае адкрыццё можа азначаць, што наш від з'явіўся ў Еўропе нашмат раней і што неандэртальцы і Homo sapiens маглі суіснаваць у Еўропе больш за

дзесяць тысяч гадоў да таго, як неандэртальцы вымерлі.

Акрамя гэтага, дадзенае адкрыццё кідае выклік цяперашнім уяўленням, паводле якіх нашы продкі хутка выцеснілі неандэртальцаў. Навукоўцы лічаць, што знаходкі ў пячоры хутчэй кажуць аб тым, што паміж двума відамі ішла барацьба на працягу тысяч гадоў, у якой перавага была то ў неандэртальцаў, то ў Homo sapiens. Пры гэтым навукоўцы не знайшлі ніякіх доказаў культурнага абмену паміж неандэртальцамі і продкамі сучасных людзей. Гэта значыць, яны сапраўды жылі ў адной пячоры, але ніколі не знаходзіліся ў ёй адначасова.

Адкрыццё працяглага ўзаемадзеяння з неандэртальцамі адпавядае адкрыццю, зробленаму ў 2010 годзе, якое выявіла, што сучасныя людзі маюць невялікую колькасць неандэртальскай ДНК, а гэта паказвае на скрыжаванне двух відаў. Навукоўцы не ведаюць, ці было гэта скрыжаванне мірным абменам партнёрамі. Магчыма, захоп жаночай асобіны або ўсынаўленне асірацелых неандэртальскіх немаўлят, якія выраслі ў асяроддзі Homo sapiens і перадалі свае гены.

Усё гэта, на думку навукоўцаў, магло быць цалкам верагодным развіццём падзей, але для таго, каб зразумець, што насамрэч адбылося ў канцы эпохі неандэртальцаў, патрэбна больш звестак.

Навукоўцы выпрацавалі мноства тэорый, каб адказаць на гэтае пытанне: выжыць дапамагла здольнасць Homo sapiens ствараць мастацтва, размаўляць і магчыма, больш развіты, чым у неандэртальцаў, мозг. Верагодней за ўсё, гэта адбылося таму, што Homo sapiens былі больш арганізаванымі: яны лепей наладжвалі сувязі, іх сацыяльныя групы былі большыя, яны здолелі захоўваць веды і ўменні, маглі выкарыстоўваць і ўдасканальваць іх.

Тэхналогіі будучыні

«МЯСНАЯ ПАРФУМА» НА ПАТЭЛЬНІ

Можна «нарошчваць» стэйк пласт за пластом

Ізраільскія вучоныя навучыліся друкаваць мяса на 3D-прынтарах. Штучнае мяса мае такую ж структуру і пах, як і сапраўднае. Пра гэта гаворыцца ў сюжэце ТСН.

«Калі яго рэжаш, вельмі падобна на сапраўднае. Вось гатаваць гэтае мяса ўжо трэба крыху інакш: яно вельмі хутка смажыцца», — распавёў шэф-кухар і кулінарны мастак Джордан Склер.

Стэйкі на яго патэльні выраслі з «мясной парфумы» — штучнай крыві з араматызатарам, менавіта дзякуючы ёй кавалкі ялавічыны і бараніны пахнуць як сапраўдныя. «Натуральнага колеру мы дасягаем з дапамогай фруктовых і агароднінных экстрактаў», — адзначыў ізраільскі біяінжынер Аляксей Тамцоў.

Навукоўцам прыйшлося распрацаваць адмысловую камп'ютарную праграму, якая старанна даследавала мяса, каб паўтарыць яго смак і пах. «Мы называем гэта «нарошчваннем», выбудоўваем прадукт пласт за пластом. Гэта дазваляе старанна кантраляваць структуру, дадаваць тлушч у тканіну, дзякуючы чаму вы амаль не здольныя па смаку адрозніць біялагічнае мяса ад нашага. Ваш мозг лічыць гэта мясам», — растлумачыў дырэктар кампаніі-вытворцы Эшар.

Адзначаецца, што «альтэрнатыўнае мяса» да канца гэтага года можа з'явіцца ў крамах. Але яго сабе зможа дазволіць не кожны вегетарыянец, бо яно будзе каштаваць 34 долары за кілаграм.

Біялогія з анатоміяй

МЕХАНІЗМ ВЫБАРУ

Растлумачаны пошук камарамі людзей па паху

Яны здольныя рабіць тое, абапіраючыся на злучэнні, якія знаходзяцца ў скурным сале. Пра гэта расказалі ў міжнароднай камандзе даследчыкаў пры ўдзеле нейрабіёлагаў з Прынстанскага ўніверсітэта ў часопісе Nature.

Камары тыпу A. aegypti, якія з'яўляюцца пераносчыкамі небяспечных захворванняў, адчуваюць пах вуглякіслага газу і пах бактэрыі Brevibacterium linens на чалавечых нагах. Але таксама казюркі могуць адчуваць і жывёлін.

Спецыялісты адрэдагавалі геном самак A. aegypti, дадаўшы ген, які дазваляе вылучаць флуарэсцэнтны бялок у мозгу — калі нейроны былі актыўныя, бялок іх «падсвечваў». Гэты эксперымент быў праведзены вучонымі для разумення, як камары адрозніваюць людзей і звяроў.

Пасля даследчыкі падвергнулі паддоследных уздзеянню пахаў ад людзей, пацукоў, сабак, авечак і іншых жывёлін. Эксперты знайшлі тры нервовыя пучкі, адзін з якіх больш выразна рэагаваў на чалавечыя пахі, другі — на жывёльныя пахі, трэці — на ўсё.

Навукоўцы выявілі два злучэнні, якія меліся ў большасці проб пахаў людзей, але рэдка сустракаліся ў жывёлін — дэканаль і ўндэканаль. Яны маюць салодкавы цытрусавы пах і знаходзяцца ў скурным сале чалавека.

У далейшым камары рэагавалі на штучныя араматычныя злучэнні.

«Было б цікава паглядзець на іншыя віды, у якіх развілася цікавасць да чалавечай крыві, напрыклад, камароў Anopheles, якія могуць перадаваць малярыю, або віды з іншымі харчовымі перавагамі, напрыклад камароў Culex, якія выбіраюць птушак», — падкрэслілі навукоўцы.

Акрамя таго, спецыялістам трэба будзе даведацца, ці будуць A. aegypti кусаць людзей, калі ў мозгу камара ліквідаваць работу адпаведнага нервовага цэнтра.

Далёкія сусветы

ВАДА ЯК КРЫНІЦА ІСНАВАННЯ

Навукоўцы выявілі планету, на якой магчымае жыццё

Калі знаходка даследчыкаў пацвердзіцца, гэта стане першым у гісторыі выпадкам выяўлення нябеснага цела з прыдатнымі для жыцця ўмовамі, якое знаходзіцца на арбіце згасальнай зоркі («белага карліка»). Брытанскія навукоўцы лічаць, што выявілі новую планету, на якой тэарэтычна магчымае жыццё, паколькі яна знаходзіцца ў так званай зоне заселенасці, дзе ўмовы могуць забяспечваць наяўнасць вады ў вадкім выглядзе.

«Мы ўпершыню ўбачылі нешта падобнае ў зоне заселенасці «белага карліка», — расказаў кіраўнік даследавання прафесар Джэй Фарыхі з Універсітэцкага каледжа Лондана. — Таму ёсць верагоднасць, што на планеце, якая круціцца па яго арбіце, ёсць жыццё».

Што такое «белыя карлікі»? Пасля смерці зоркі вельмі вялікага памеру ператвараюцца ў чорныя дзіркі. Але драбнейшыя, такія як Сонца, становяцца «белымі карлікамі», гэта значыць, зоркамі, якія выкарысталі сваё ядзернае паліва і страцілі вонкавыя пласты. Звычайна яны не перавышаюць планеты па памеры і пасля фарміравання маюць бела-блакітнае свячэнне. Планета ў зоне заселенасці, аб якой гавораць навукоўцы, размешчана на адлегласці 117 светлавых гадоў ад Зямлі. Мяркуецца, што яна знаходзіцца ў 60 разоў бліжэй да сваёй зоркі ў параўнанні з дыстанцыяй ад Зямлі да Сонца.

Зрэшты, у брытанскіх астраномаў пакуль няма прамых доказаў існавання гэтага нябеснага цела. Яны вымушаны спадзявацца на звесткі аб перамяшчэннях 65 іншых аб'ектаў памерам з Месяц, якія знаходзяцца ў зоне заселенасці (яе таксама называюць «зонай Залатавалоскі»). Аб'екты застаюцца на роўнай адлегласці адзін ад аднаго, а гэта кажа аб тым, што іх утрымлівае гравітацыя нейкай блізкай планеты.

«Члены нашай групы былі проста ўражаны, — адзначыў прафесар Фарыхі. — Рух аказаўся настолькі дакладным, што такое нават і прыдумаць немагчыма».

А зона заселенасці — гэта вобласць у космасе каля той ці іншай зоркі, дзе адлегласць ад сярэдзіны не занадта вялікая, каб там было вельмі холадна, і не занадта блізкая, каб там было вельмі горача. Калі ўмовы на планеце адпавядаюць гэтым патрабаванням, там можа існаваць вада ў вадкім выглядзе, такім чынам, і жыццё.

Вынікі даследавання брытанскіх навукоўцаў азначаюць, што зараз астраномы павінны актыўна шукаць новыя планеты каля іншых «белых карлікаў». «Звычайна ў астраноміі так: калі выяўляецца нешта адно, то, як правіла, гэта распаўсюджаная з'ява», — адзначыў Фарыхі.

Сяргей СТАРЫНАЎ.
Фота з адкрытых крыніц.

Як у Беларусі ўдасканальваецца сістэма назірання цяжарных і родадапамогі

СКЛАДНІКІ КАМФОРТНАГА МАЦЯРЫНСТВА

У рэйтынгу краін шчаслівага дзяцінства Беларусь займае 35-е месца са 175 краін свету. Таксама знаходзіцца на 25-й пазіцыі ў рэйтынгу самых камфортных краін для мацярынства і ўваходзіць у 50 найлепшых краін па вядзенні цяжарнасці і арганізацыі родаў. Як удасканальваецца працэс вядзення цяжарнасці і якія новыя тэхналогіі з'явіліся ў беларускіх акушэраў-гінеколагаў? Ці даступныя яны жанчынам у раённых цэнтрах і невялікіх пасёлках? Чаму партнёрскіх родаў мусіць быць больш? Пра гэта і іншае расказалі спецыялісты Міністэрства аховы здароўя, РНПЦ «Маці і дзіця» і кіраўнікі радзільных дамоў у сталіцы і рэгіёнах.

ВЫХОДЖВАЮЦЬ НЕМАЎЛЯТ ВАГОЙ ДА 500 ГРАМАЎ

— У Беларусі самы нізкі паказчык смяротнасці немаўлят у параўнанні з іншымі краінамі СНД і многімі развітымі краінамі свету, уключаючы Вялікабрытанію, Данію, Польшчу, ЗША, Літву. З 1994 года ў нас выходжваюць немаўлят вагой да 500 грамаў, а выжывальнасць дзяцей з экстрэмальна нізкай масай цела на першым годзе жыцця складае 80 %, — праінфармаваў **галоўны спецыяліст аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Леанід НЕДЗЕНЬ**.

Беларусь стала першай і адзінай дзяржавай у Еўропе і трэцяй у свеце разам з Кубай і Тайландам, дзе ўдалося выкараніць перадачу ВІЧ ад маці да дзіцяці і прыроджанага сіфілісу да ўзроўню, які не складае пагрозы грамадскаму здароўю.

Больш за 97 % цяжарных жанчын на ранніх тэрмінах звяртаецца ў жаночыя кансультацыі. Біяхімічным скрынінгам, раннім выяўленнем сіндрому Даўна і іншых генетычных спадчынных захворванняў ахоплена больш за 70 % усіх цяжарных жанчын. Скрынінгавае ўльтрагукавое абследаванне праходзіць больш за 95 % усіх будучых мам. Штогод выяўляецца каля 1500 выпадкаў прыроджаных парокаў развіцця.

У стацыянарных умовах праходзіць больш за 99 % родаў. Радзільныя дамы працуюць па сістэме сумеснага знаходжання і падтрымкі груднога кармлення. Адразу пасля нараджэння разам з маці знаходзіцца больш за 90 % немаўлят. Для добразычлівай абстаноўкі з 2018 года ўсе радзільныя дамы адкрытыя для наведвання роднымі і блізкімі, ва ўстановах родадапамогі праводзяцца партнёрскія роды.

У краіне функцыянуе адзін перынатальны цэнтр 4-га ўзроўню — гэта Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця», 17 перынатальных цэнтраў 3-га ўзроўню, 27 перынатальных цэнтраў 2-га ўзроўню і 64 арганізацыі аховы здароўя, якія адносяцца да 1-га раённага ўзроўню.

КАРЭКЦЫЯ ПРЫРОДЖАНЫХ ПАРОКАЎ РАЗВІЦЦЯ

Намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ «Маці і дзіця», кандыдат медыцынскіх навук Іван КУРЛОВІЧ пацвердзіў, што Беларусь у галіне родадапамогі і догляду цяжарных жанчын з'яўляецца ўзорам для іншых дзяржаў, і падзяліўся прыкладамі і спосабамі рэалізацыі вышэйпералічаных праграм на практыцы.

Паводле яго слоў, Беларусь выкарыстоўвае розныя высокаэфектыўныя метады і найноўшыя тэхналогіі ў перынаталогіі. Прыярытэтнымі з'яўляюцца: кровазберагальныя тэхналогіі, малаінвазійная хірургія, фетальная медыцына, клетачныя тэхналогіі, інтэнсіўная неанаталогія, дыягностыка спадчынных і прыроджаных захворванняў.

— Асноўныя перспектыўныя напрамкі навуковай дзейнасці службы аховы здароўя маці і дзіцяці — гэта перш за ўсё распрацоўка новых тэхналогій, накіраваных на зніжэнне першаснай дзіцячай інваліднасці і мінімізацыю негатыўных наступстваў для дзіцяці і сям'і, заснаваных на прымяненні клетачнай тэрапіі, штучнага інтэлекту і новых арганізацыйных формаў пры аказанні медыцынскай дапамогі нованароджаным і дзецям ранняга ўзросту. Гэта распрацоўка комплексных праграм перынатальнай дыягностыкі і ўнутрывутробнага лячэння анамалій плода, укараненне новых тэхналогій, накіраваных на захаванне і рэалізацыю рэпрадуктыўнай функцыі, захаванне рэпрадуктыўнага патэнцыялу ў жанчын з анкалагічнымі захворваннямі да правядзення спецыфічнага лячэння, паляпшэнне выхаду экстракарпаральнага апладнення.

У РНПЦ «Маці і дзіця» адбываецца прыкладна 5 % ад агульнай колькасці родаў з усёй краіны. Цэнтр выкарыстоўвае дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі і з'яўляецца адной з трох медыцынскіх устаноў, дзе выконваецца бясплатная спроба ЭКА. За 2021 год 30 % жанчын, якія скарысталіся ЭКА, паспяхова зацяжарэлі.

Як адзначае Іван Курловіч, не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце павялічваецца ўдзельная вага аперацый кесарава сячэння: у Заходняй Еўропе іх каля 25 %, у Цэнтральнай Амерыцы — 31 %, у Паўночнай Амерыцы — 24 %, у ЗША — 32 %. У Беларусі за 2021 год гэты паказчык склаў каля 32 %. Колькасць выяўленых выпадкаў прырашчэння, або ўрастання плацэнты, з якім сутыкаюцца жанчыны пасля правядзення аперацыі кесарава сячэння, павялічылася за апошнія дзесяці гадоў у 12 разоў. Гэта найбольш цяжкае ўскладненне цяжарнасці, якое патрабуе правядзенні дыягностыкі і медыцынскай прафілактыкі крывацёку. У цэнтры распрацаваны і ўкаранёны кровазберагальныя тэхналогіі пры родах у жанчыны з урастаннем плацэнты, якія дазваляюць знізіць рэпрадуктыўныя страты і накіраваны на захаванне рэпрадуктыўнай функцыі.

Адзін з прыярытэтных у акушэрстве напрамкаў — фетальная хірургія. Яна развіваецца ў нашай краіне каля 12 гадоў. Выконваецца каля 50 аперацый у год па ўнутрыўлонным пералівanні крыві падчас цяжарнасці.

ПРАЕКТ «МАМА PRO» І ПАРТНЁРСКІЯ РОДЫ

Дзіяна МАРДАС, кіраўнік і заснавальніца праекта, расказала, што яго аўдыторыя — больш за 200 тысяч мам і тат. Для сувязі выкарыстоўваюцца стандартныя каналы камунікацыі: супольнасць у Viber складае больш за 50 тысяч чалавек, таксама існуюць Telegram-чаты па даце родаў, дзе бацькі аб'ядналіся па інтарэсах і аднолькавых праблемах.

— Мы ствараем і свае каналы камунікацыі: адукацыйны партал «Мама PRO» за 2021 год меў больш за два мільёны наведванняў, а мабільны дадатак «Мама PRO» мае 62 тысячы ўстановак. Гэтыя каналы выкарыстоўваюцца, каб даносіць якасную і праўдзівую інфармацыю ад экспертаў і медыцынскай супольнасці, — расказала Дзіяна Мардас.

Запушчаны праект «PRO радом» — гэта сістэма выязных экскурсій ва ўстановы аховы здароўя, дзе будучыя бацькі могуць загадзя ўбачыць абсталяванне радзільнага дома.

Асобную ўвагу Дзіяна Мардас аддала камунікацыі і бяспецы інфармацыі ў інтэрнэце, важнасці прысутнасці кваліфікаваных урачоў у тых каналах камунікацыі, дзе найбольш часу праводзіць пацыентка.

На важнасць партнёрскіх родаў, усвядомленага не толькі мацярынства, але і бацькоўства звярнуў увагу **намеснік галоўнага ўрача па акушэрска-гінекалагічнай дапамозе 5-й гарадской клінічнай бальніцы, кандыдат медыцынскіх навук Васіль ШОСТАК**.

— Партнёрскія роды за мяжой складаюць больш за 90 %. На сёння ў нашай краіне гэтая лічба вельмі нізкая, нават непрыстойна пра яе казаць. Напрыклад, Казахстан мае 98 % партнёрскіх родаў, таму нам ёсць да чаго імкнуцца. Бацькамі становяцца ў радзільным доме, і нядрэнна было б гэта рабіць разам з каханай жанчынай, маці дзіцяці, — сказаў суразмоўнік.

5-я гарадская клінічная бальніца з'яўляецца не толькі перынатальным цэнтрам 3-га ўзроўню, але і самым вялікім радзільным домам нашай краіны — і па ложкавай магутнасці, і па колькасці праведзеных родаў. У 2021-м іх было 5513, народжана 5571 немаўля. Адметнай асаблівасцю ўстановы з'яўляецца тое, што там вядуцца роды, якія немагчымыя ў іншых абласцях і раёнах краіны. Калі па ўсёй Беларусі колькасць аперацый кесарава сячэння з кожным годам павялічваецца, то ў 5-м радзільным доме яна памяншаецца: за 2021 год іх было ўсяго 19 %.

ВІЦЕБШЧЫНА: НЯМА ПРАБЛЕМ З КАДРАМІ

Як адзначыла **галоўны ўрач Віцебскага абласнога клінічнага радзільнага дома Алена ЛЕАНОВІЧ**, у вобласці з 18 раёнаў дзевяць не аказваюць дапамогі па родах. На першым узроўні аказання перынатальнай дапамогі маецца 22 % ложкавага фонду і нараджае каля 10 % жанчын усёй Віцебшчыны. Другі ўзровень прадстаўлены Аршанскім і Наваполацкім радзільнымі дамамі, а таксама абсервацыйным аддзяленнем Віцебскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. Апошні мае 45 % ложкавага фонду і прымае 40 % родаў вобласці. Трэці ўзровень прадстаўлены Віцебскім абласным радзільным домам і Віцебскім гарадскім клінічным радзільным домам № 2, якія валодаюць 33 % ложкавага фонду і праводзяць 49 % родаў. На чацвёрты тэхналагічны ўзровень накіроўваецца 1,5 % жанчын.

— У аснове арганізацыі дапамогі жанчынам ляжыць пастулат аб максімальным выяўленні адхіленняў падчас праходжання цяжарнасці і стварэнні максімальна спрыяльных умоў для цяжарнай жанчыны падчас яе лячэння, родаў і аказання своечасовай спецыялізаванай дапамогі нованароджанаму дзіцяці, — адзначыла галоўны ўрач.

У абласным радзільным доме 156 акушэрскіх ложкаў, 4 жаночыя кансультацыі, ён абслугоўвае 72 % сельскага насельніцтва вобласці і 78 % насельніцтва Віцебска.

— Далучэнне жаночых кансультацый да радзільнага дома дазваляе максімальна эфектыўна выкарыстоўваць кадры, фінансы, медыцынскае абсталяванне, — лічыць Алена Леановіч. — Нават у пандэмію ў нас не было праблем з кадрамі і іх перамяшчэннем.

ГРОДЗЕНШЧЫНА: ПРЫНЦЫПЫ БЯСПЕЧНАГА МАЦЯРЫНСТВА

Намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце Гродзенскага абласнога клінічнага перынатальнага цэнтра Кацярына НАВАСАД адзначыла, што нягледзячы на змяншэнне колькасці родаў як па ўсёй краіне, так і ў Гродзенскай вобласці, у перынатальным цэнтры, а ён з'яўляецца медыцынскай установай 3-га ўзроўню, у 2021 годзе колькасць родаў павялічылася. Тут адбываецца больш за 40 % усіх родаў у вобласці і, у прыватнасці, 66 % заўчасных, што сведчыць аб эфектыўнай рабоце сістэмы маршрутызацыі.

Перынатальны цэнтр вітае партнёрскія роды: пасля паляпшэння эпідэмічнай сітуацыі яны адноўлены і праводзяцца бясплатна. Па распараджэнні Міністэрства аховы здароўя ў Гродзенскай вобласці, у прыватнасці, у перынатальным цэнтры распрацаваны і рэалізаваны праект неагрэсіўнага вядзення цяжарнасці і родаў, укаранёны прынцыпы бяспечнага мацярынства. Выкарыстоўваецца методыка пралангіравання цяжарнасці пры заўчасным сыходжанні каляплодных водаў, што дазваляе зменшыць захваральнасць нованароджаных.

БРЭСТЧЫНА: МЕДЫКА-ГЕНЕТЫЧНАЯ ДАПАМОГА

Брэсцкі абласны радзільны дом таксама адносіцца да 3-га тэхналагічнага ўзроўню. Тут канцэнтруюцца самыя складаныя выпадкі па ўсёй вобласці. Радзільны дом аказвае ў тым ліку і спецыялізаваную медыка-генетычную дапамогу. Гэта камбінаваны скрынінг першага трымястра, ультрагукавы і біяхімічны скрынінг, медыка-генетычнае кансультаванне.

У Брэсцкай вобласці працуюць рэгіянальныя перынатальныя цэнтры 2-га ўзроўню — у Пінску і Баранавічах. Па выніках скрынінгу выяўляюцца групы рызыкі па храмасомнай паталогіі, таксама праводзіцца інвазійная прэнатальная дыягностыка і кансультаванне па яе выніках.

Спецыялізаваная акушэрска-гінекалагічная служба прадстаўлена кабінетамі планавання сям'і, бясплоднасці, дзіцяча-падлеткавай гінекалогіі, гінекалагічна-эндакрыннай паталогіі. З 2017 года ўведзены адзін з метадаў дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій — унутрыматачная інсемінацыя. Паказчык яе эфектыўнасці ў межах 10-12 % пры тым, што агульнасусветны складае 2–12 %.

На базе радзільнага дома працуе камісія па адборы пацыентаў для прадастаўлення адной бясплатнай спробы ЭКА. За 2021 год выдадзены дазвол на бясплатную спробу каля 200 жанчынам.

— Я хачу звярнуць увагу на свядомае планаванне сям'і, свядомае бацькоўства і важнасць правядзення прэгравідарнай падрыхтоўкі (да зачацця), таму што толькі падрыхтаваная і здаровая сям'я можа нарадзіць здаровае дзіця, — заўважыла **псіхатэрапеўт Брэсцкага абласнога радзільнага дома Алеся САНКОЎСКАЯ**.

Алена КРАВЕЦ.

ПЛЕЩЕНИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 28 июня 2022 года открытого аукциона по продаже земельных участков на территории Плещеницкого сельсовета Логойского района

Номер лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке зем. документации	Сумма задатка, бел. руб.
Аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома						
